ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 128 (1095) ЧАЦЬВЕР, 5-га чэрвеня 1930 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менскага АК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:

1 месяц	30 кап.
3 месяцы	90 "
6 месяцаў	1 р. 80 "
1 год	3 р. 30 "

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ:
Комсамольская 25, тэлеф. № 903.

ГОД ВЫДАНЬНЯ X.

Кошт асобнага №—2 кап.

XIII Зьезд КП(б)Б

„БРАТОМ ПА РЭВАЛЮЦЫЙНАЙ БАРАЦЬБЕ, БРАТОМ ПА КЛЯСЕ"

Прамова тав. Будзінскага

(Адказ ад імя зьезду на прывітаньне прадстаўнікоў рэволюцыйных працоўных Кітаю.)

Таварышы! Адна кароткая, сухая тэлеграма аб тым, што адчыніўся першы зьезд Саветаў у Кітаі і наш партыйны зьезд аднадушна пасылае баявое прывітаньне нашым братом па рэвалюцыйнай барацьбе, братом па клясе.

Прыход на XIII зьезд прадстаўнікоў рэвалюцыйных кітайскіх працоўных мас у асобе дэлегацыі студэнтаў, якія тут у нас вывучаюць увесь пераможны шлях савецкага пролетарыяту, выклікаў новы ўзрыў энтузіязму. Усё гэта зьяўляецца лепшым довадам тэй цеснай інтэрнацыянальнай сувязі, якая існуе паміж намі—пролетарамі БССР і пролетарамі і таксама працоўнымі масамі далёкага географічна, але блізкага па рэволюцыйнай барацьбе Кітаю. (Доўгія воплескі).

Я думаю, што правільна перадаю пачуцьці ўсіх нас, калі гавару што ў гэтым гарачым прывітаньні, якім тут, на зьезьдзе, былі спатканы нашы таварышы—кітайскія рэволюцыйныя студэнты—мы выказваем менавіта нашую любоў і нашу солідарнасьць з працоўным рэволюцыйным Кітаем, якія, ня гледзячы на свае часовыя паражэньні ў барацьбе з генэральска-компрадэрска-джэнтрыйскай контр-рэвалюцыяй і сусьветным імпэрыялізмам, ня гледзячы на ўсе здрады, ідзе наперад па тым шляху, па якім мы, пад кіраўніцтвам Леніна і нашай слаўнай УсеКП(б), прасоўваліся і перамаглі (Працяжныя воплескі).

На гэтым шляху, на які ўсё больш цьвёрда ўстае кітайскі пролетарыят пад кіраўніцтвам сваёй Кітайскай Компартыі і пад кіраўніцтвам Комінтэрну, ён прыдзе да перамогі, як мы прышлі да перамогі ў Кастрычніку.

У нашай штодзённай барацьбе і працы па будаўніцтве соцыялізму ў нашым краі, мы ствараем тое, што зьяўляецца галоўным рычагом перамогі сусьветнага пролетарыяту, у тым ліку і кітайскага пролетарыяту. Лепшым довадам таго, што нашыя замежныя таварышы ўмеюць пераняць ў нас тое, што зьяўляецца самым важным дзеля перамогі над клясавым ворагам—гэта сёньняшняе выступленьне кітайскіх таварышоў.

Кожны з нас у прывітаньні таварыша з Гуань-Дуня пачуў, што ён ня кепска ўзброіўся аружжам, якое зьяўляецца асноўным дзеля перамогі рэволюцыі, што ён ня кепска трымае ў руках зброю марксысцка-ленінскай тэорыі.

Сёньня, таварышы, калі ўсюды мы бачым чыньнікі разлажэньня капіталізму, калі самыя заядлыя сьпевакі капіталізму ўжо не гавораць аб стабілізацыі, калі паявляючаюцца факты расхістваньня гнілой, нятрывалай, часовай стабілізацыі капіталізму, калі рабочыя масы ідуць усё больш шырокім фронтам у контр-наступленьне, мы асабліва горача вітаем прадстаўнікоў кітайскага пролетарыяту, рэволюцыйных кітайскіх працоўных і эксплёатуемых мас, таму, што яны на даным этапе выступаюць застрэльшчыкамі, што яны зьяўляюцца першымі языкамі полымя міжнароднай пролетарскай рэволюцыі, якая разгараецца з новай сілай ва ўсім сьвеце. Гарыць паўстаньнем Індыя. У Інда-Кітаі рэволюцыйнае бушаваньне таксама патрасае грунт сусьветнага капіталізму.

Наша рэволюцыйная барацьба, наша соцыялістычнае будаўніцтва зьяўляюцца самай дзейнай дапамогай міжнароднай рэволюцыйнай барацьбе працоўных і эксплёатаваных мас на чале з рэволюцыйным пролетарыятам. Мы гэта бачым, вось чаму мы так горача віталі нашых кітайскіх братоў.

Таварышы, імпэрыялізм прабуе пасеяць недавер'е, парваць тую нітку міжнароднай солідарнасьці, якая нас цесна зьвязвае з працоўнымі масамі ўсяго сьвету. Сусьветны капітал прабуе нас уцягнуць у вайну і таксама ўцягнуць у гэтую вайну супроць нас масы працоўных. Мы бачылі, як на Манчжурскай граніцы, дзе адбывалася гэтая спроба ўцягнуць нас у вайну, імпэрыялізм пацярпеў паражэньне. Наша пераможная Чырвоная армія змагла 9 месяцаў цярпліва, з вялізарнай вытрыманасьцю стаяць на граніцы і адказваць маўчаньнем на гэтую правакацыю. Са ўсіх бакоў у буржуазным друку крычалі па нашым адрасе: бальшавікі трусяць, яны баяцца нават кепска ўзброеных, кепска дысцыплінаваных разбойнічых банд Мукдэна. Мы на гэта не зварачалі ўвагі, бо наша мэта, наша задача была ня столькі біцца з кітайскімі мілітарыстымі, колькі братацца з кітайскімі працоўнымі масамі. Мы білі генэралаў, наколькі гэта патрэбна было, каб іх прывесьці ў чуйнасьць, мы браталіся з працоўнымі кітайскімі масамі, каб замацаваць узы міжнароднай солідарнасьці. І мы ў гэтай барацьбе з імпэрыялізмам перамаглі ня толькі ў тым сэнсе, што наша слаўная Чырвоная армія ў два дні прайшла вялізарнейшыя абшары, ломячы супраціўленьне кітайскіх мілітарыстых, але і ў тым сэнсе, што мы перакапалі кітайскія працоўныя масы, нават найбольш адсталыя, якія зьяўляюцца часта сьляпою зброяй у руках кітайскіх імпэрыялістых, у тым, што мы—бальшавікі—іх браты, у тым, што мы сваёй барацьбой вядзем іх на шлях вызваленьня і ад сваіх і ад чужых насільнікаў і эксплёататараў.

Вось, таварышы, што галоўнае, што трэба бачыць для таго, каб мы змаглі даць адпор сусьветнаму імпэрыялізму. Перад намі задача—працаваць мацней, шпарчэй па лёзунгу, дадзеным кітайскімі таварышамі—выканаць пяцігодку ў чатыры гады. Яны правы, што наша Чырвоная армія з аднаго боку, нашы тэмпы соцыялістычнага будаўніцтва, з другога—вось галоўнейшыя рычагі нашай перамогі над сусьветным імпэрыялізмам.

Няхай жыве наша праца па выкананьню пяцігодкі ў чатыры гады!

Няхай жыве наша ленінская Усе КП(б)!

Няхай жыве Комінтэрн—правадыр сусьветнай пролетарскай рэволюцыі!

Няхай жыве разгортваючаяся ў Кітаі рэволюцыя пад кіраўніцтвам Кітайскай Компартыі і Комінтэрну! (Працяжныя воплескі).

Рэзолюцыя

бюро ЦК ЛКСМБ ад 29 мая 1930 году

1. Абгаварыўшы артыкул, зьмешчаны ў „Комсомольской Правде" ад 21 мая 1930 г. № 114 (1502) „На полпути", бюро ЦК ЛКСМБ прызнае, што ў пастановах бюро і пленуму ЦК ЛКСМБ аб прызнаньні дапушчаных палітычных памылак у рабоце па колектывізацыі, якія (пастановы) у асноўным вычэрпваюць дапушчаныя памылкі, аднак у гэтых пастановах не адзначана яўна-палітычна памылковая пастанова ЦК па дакладах Бабруйскага, Магілеўскага і Аршанскага АК у пытаньні ліквідацыі кулацтва, як клясы, што давала магчымасьць тлумачыць і праводзіць ліквідацыю кулацтва не на базе суцэльнай колектывізацыі. Пасьлядоўнымі-ж рашэньнямі бюро ЦК ЛКСМБ у гэтым пытаньні была дана яскравая ўстаноўка:

„На грунце шырока разгорнутай суцэльнай колектывізацыі „цэлых раёнаў, акруг, на аснове шырокай мобілізацыі батрацка-бядняцкіх і серадняцкіх мас вакол асноўных задач партыі, мы маем поўную магчымасьць праводзіць безадкладную лінію партыі на ліквідацыю кулацтва, як клясы. Практычная работа вакол гэтых задач павінна зводзіцца да таго, каб комсамольскія організацыі працуючы ў справе колектывізацыі сельскай гаспадаркі (суцэльных акруг, раёнаў, сельсаветаў) павінны мобілізаваць шырокія масы комсамольцаў і беспартыйна-батрацка-бядняцкай і серадняцкай моладзі на выкананьне гэтых задач, узмацніўшы свой актыўны ўдзел па поўнаму выкананьню гэтага, асабліва у час вясеньняй пасеўкампаніі.

АК, РК, ячэйкі павінны шырока растлумачыць і праводзіць у жыцьцё дырэктывы партыі ў адносінах ліквідацыі кулацтва, як клясы, рашуча змагаючыся з мэтадамі „адміністраваньня, бяз удзелу бядняцка-серадняцкіх мас". (З пастановы бюро ЦК ЛКСМБ, ад 13-І-30 г.).

Аднак, памылка ЦК паглыбляецца тым, што ня была адменена пастанова, якая давала няправільную ўстаноўку ў пытаньнях ліквідацыі кулацтва, як клясы, у рэзолюцыі ад 27-І-30 г. па дакладах з месц.

2. Прапанаваць АК ЛКСМБ, разам з прапрацоўкай пастаноў майскага пленуму ЦК ЛКСМБ і 7-га пленуму ЦК УсеЛКСМ, давесьці да шырокіх колаў комсамольцаў пастановы бюро і пленуму ЦК ЛКСМБ аб прызнаньні дапушчаных памылак у рабоце па колектывізацыі, мобілізаваўшы організацыі на выкрыцьцё і канчатковае выпраўленьне скажэньняў лініі партыі.

3. Гэту пастанову зьмясьціць у друку і даслаць „Комсомольской Правде".

Адказ на прывітаньні працоўных Менску, Воршы і Бабруйску

Прамова Тав. Грысевіча.

Таварышы, сёнешняя дэмонстрацыя працоўных Менску сьведчыць аб глыбокай сувязі нашай партыі з шырокімі працоўнымі масамі. Тыя прывітаньні, якія мы заслухалі ад працоўных Менску, Воршы і Бабруйску, ад с-г лес. рабочых, ад колгасьнікаў Бабруйшчыны і Меншчыны яшчэ раз пацьвярждаюць аб тэй глыбокай рабоце, якую прарабілі мы, аб тым глыбокім давер'і з боку рабочых батрацка-бедняцкіх-серадняцка-сялянскіх мас да нашай партыі.

Той лёзунг, які зараз ператвараецца ў жыцьцё—пяцігодка ў чатыры гады, патрабуе ад нас, каб у другое пяцігодзьдзе гэтага году прарывы, якія аказаліся ў нашай прамысловасьці, выправіць. Толькі тады, толькі ў сувязі з гэтым і на грунце гэтага мы здолеем нашу пяцігодку выканаць у чатыры гады.

Таварышы, тыя запэўніваньні, якія тут рабіліся навуковымі працаўнікамі, настаўніцтвам і інжынэрна-тэхнічнымі працаўнікамі—гавораць аб тым, што тыя задачы, якія зараз партыя ставіць, як лёзунг, які зараз ператвараецца ў жыцьцё — пяцігодку ў чатыры гады—бязумоўна выканаем. Для выкананьня пяцігодкі нам трэба забясьпечыць нашу прамысловасьць тэхнічнымі сіламі.

Трэба сказаць, што ў нас яшчэ ў справе падрыхтоўкі кваліфікаванай рабочай сілы, інжынэрна-тэхнічнага, настаўніцкага складу яшчэ недастаткова праароблена работы для таго, каб ажыцьцяўляць нашу пяцігодку ў чатыры гады. Таму перад нашымі навучальнымі ўстановамі, перад нашым інжынэрна-тэхнічным пэрсаналам стаіць задача рабіць тое, як рабочая кляса—ажыцьцяўляць пяцігодку ў чатыры гады, прарывы, якія ў нас ёсьць на культурным фронце, у падрыхтоўцы тэхнічных кадраў, каб былі папоўнены як мага хутчэй.

Тыя пытаньні, якія стаяць на нашым зьезьдзе, як далейшая індустрыялізацыя Сав. Беларусі, далейшая сацыялістычная перабудова нашай вёскі—усё гэта выклікае патрэбу ў інжынэрна-тэхнічных сілах.

Пад кіраўніцтвам нашага ЦК партыі мы пойдзем яшчэ шпарчэй па шляху сацыялістычнага будаўніцтва, пастановы, якія вынясе наш XIII зьезд КП(б)Б, бязумоўна пры дружным падтрыманьні ўсяе рабочае клясы, батрацка-бядняцкіх і серадняцкіх мас, усяго культурна-тэхнічнага пэрсаналу нашай Беларусі будуць праведзены у жыцьцё. (Воплескі).

УВЕСЬ ПАЎДНЁВЫ КІТАЙ АХОПЛЕН САВЕТАМІ

Рабочыя і сяляне голымі рукамі адбіраюць аружжа ў войск контр-рэволюцыі. Яны выганяюць земляўласьнікаў, яны ствараюць уласную рэволюцыйную ўладу—уладу саветаў. Чырвоныя арміі Кітаю сталі гразой для гоміндапаўскіх мілітарыстых і іх імпэрыялістычных паноў.

Пасьля гоміндапаўскай контр-рэволюцыі 1927 году прыгнечаныя сялянскія масы Кітаю ўзяліся за аружжа і пачалі па прыкладу кітайскага пралетарыяту змагацца за савецкую ўладу на сяле. Імпэрыялістыя і фэўдальная Гоміндапаўская кліка падаўлялі сялянскія паўстаньні шляхам самых жорсткіх захадаў. Ня гледзячы на гэта, новы рэволюцыйны ўздым прывёс з сабою ўзьнікненьне савецкай улады ў вялікай колькасьці кітайскіх сёл і вёсак. Увесь паўднёвы Кітай ахоплен Саветамі. Рабочыя і сяляне голымі рукамі адбіраюць аружжа ў войск контр-рэволюцыі. Яны выганяюць зямляўласьнікаў, яны ствараюць уласную рэволюцыйную ўладу—уладу саветаў.

Гэтая рыса кітайскай рэволюцыі адкрывае новую цудоўную старонку ў гісторыі міжнароднага рэволюцыйнага руху.

Чырвоныя арміі сталі гразой для гоміндапаўскіх мілітарыстых і іх імпэрыялістычных паноў. Газэты мілітарыстых пішуць ужо, што „чырвоныя бандыты" зьяўляюцца сілай, якую падзвычайна цяжка перамагчы. Генэрал Кін-Ханцін пісаў другому генэралу ў лісьце, захопленым часткамі IV арміі:

„Пытаньне аб комуністычных бандытах у Цзянсі стала вельмі сур'ёзным. Мы знаходзімся ў цяжкім становішчы. Мы ня ведаем, колькі ў іх байцоў, ня ведаем, дзе яны. Калі нашыя часткі прыходзяць у сёлы, ні на кога, пачынаючы ад сялян і канчаючы ўласнымі салдатамі, немагчыма палажыцца. Лясы і лугі, здаецца, таксама ператвараюцца ў нашых ворагаў".

У сучасны пэрыод, калі захістаўся ўвесь фундамант кітайскага рэакцыйнага рэжыму, рабочы і сялянскі рух пачаў разьвівацца з нябачнай хуткасьцю.

Кітайская компартыя, уся кітайская фэдэрацыя профсаюзаў і шанхайская фэдэрацыя профсаюзаў, імкнучыся пасіліць пролетарскае кіраўніцтва сялянскім рухам, рашылі склікаць першы зьезд саветаў Кітаю.

Пэрспэктыва стварэньня савецкай улады ўжо не ў паветах, а ў цэлых правінцыях Кітаю становіцца ўсё больш рэальнай. Ажыцьцяўленьне гэтай задачы зьяўляецца першачарговым пытаньнем кітайскай рэволюцыі ў сучасны момант. Яно неабходна для згуртаваньня сіл, для стварэньня базы для далейшага разьвіцьця рэволюцыі. Зьезд саветаў Кітаю павінен будзе весьці ўсю сваю работу імення ў гэтым напрамку. Ён павінен будзе выпрацаваць агульную пляцформу для мільёнаў рабочых і сялян, падняўшых сьцяг рэволюцыі.

Значэньне першага зьезду саветаў Кітаю—вялізарнае. Ня гледзячы на пасіленьне гоміндапаўскага белага тэрору, ня гледзячы на карныя экспэдыцыі імпэрыялістых—масавыя забойствы, учыненыя нядаўна французамі ў Цзянсі, і падрыхтоўваемую імпэрыялістымі Ангельшчыны, Японіі і Злуч. Штатаў простую інтэрвэнцыю супроць кітайскай рэволюцыі—з дапамогай сусьветнага пралетарыяту Савецкі Кітай у сваёй гэроічнай барацьбе выйдзе пераможцам.

Ло-Ці-Ін

прадстаўнік кітайскага комсамолу ў ІК КІМ.

Мобілізацыя 500 комсамольцаў у сельрайкомы

МАСКВА, Бюро ЦК УсеЛКСМ рашыла мобілізаваць 500 актывістых комсамольцаў на работу ў якасьці сэкратароў сельрайкомаў.

XIII зьездзе КП(б)Б

Ад XV—да XVI зьезду УсеКП(б)

Даклад Д. З. Мануільскага на XIII зьездзе КП(б)Б

Міжнароднае становішча

1. Уводзіны

Таварышы! Ад імя Цэнтральнага Камітэту Ўсесаюзнай Комуністычнай Партыі, ад імя Выканаўчага Камітэту Комуністычнага Інтэрнацыяналу вітаю XIII зьезд Комуністычнай партыі Беларусі і ў вашай асобе працоўных Беларускай Савецкай Соцыялістычнай Рэспублікі (**Бурныя апплёдысмэнты**).

За два з паловаю гады, што мінулі з часу XV партыйнага зьезду, адбыліся падзеі буйнейшага міжнароднага і ўнутранага палітычнага значэньня.

За гэты час разразіўся сусьветны эканамічны крызыс, які выклікае самыя цяжкія вынікі для ўсяго гаспадарчага і палітычнага жыцьця капіталістычнага сьвету. Рэзка абвастрыліся як зьнешнія, так і ўнутраныя супярэчнасьці ўсёй імпэрыялістычнай сыстэмы, узмацнілася клясавае змаганьне ва ўсім сьвеце. Пачынаючы з 1928 году, стаў усё больш выразна абазначацца нарастаючы рэвалюцыйны пад'ём, які выліваецца ў хвалю забастовак, дэманстрацый, а дзе-ні-дзе і ў пакуль яшчэ разрозьненыя рэвалюцыйныя паўстаньні ў калёніях.

Зноў, таварышы, Кітай становіцца пляцдармам вялікіх рэволюцыйных баёў. І той край, аб якім на X пленуме ВККІ мы гаварылі, што ён зьяўляецца вогнішчам грандыёзных рэволюцыйных падзей—Індыя, прыведзены ў цяперашні час у вялікі рух.

За гэтыя гады яшчэ больш умацаваліся комуністычныя партыі, адбылося ачышчэньне іх ад цэлага раду опортуністычных элемэнтаў. Побач з гэтымі буйнейшымі падзеямі і зрухамі ў міжнароднай абстаноўцы адбываўся процэс далейшага ўмацаваньня краю пролетарскай дыктатуры, разгорталася нябачана ў сьвеце соцыялістычнае будаўніцтва, ажыцьцяўляўся наш пяцігадовы плян, разгарнулася колектывізацыя нашай сельскай гаспадаркі. Мы бачым, што побач з рэволюцыйным пад'ёмам у капіталістычных краёх разгарнуўся вялікі пад'ём рэволюцыйнай энэргіі энтузіязму працоўных у нашым краі. Мы павялі па ўсіх лініях наступленьне на капіталістычныя элемэнты гораду і вёскі. Мы перайшлі ад політыкі абмежаваньня кулацтва да політыкі ліквідацыі кулацтва як клясы. На фоне гэтай супярэчнасьці дзьвюх сусьветных сыстэм—будуючагася соцыялізму і капіталізму, які ідзе да сваёй пагібелі,—вырасла ваенная небясьпека супроць Савецкага Саюзу, адна за адной ідуць у гэтыя гады провакацыі ў адносінах да савецкай дзяржавы. Мы перажылі з вамі конфлікт па Ўсходня-Кітайскай чыгунцы. Мы мелі папярэджаную спробу выбуху ў Варшаўскім поўнамоцным прадстаўніцтве, і мы ведаем, што рад провакацый далёка ня скончыўся. Але ў гэтыя бурныя гады вялікага пераломy, у гады рэволюцыйнага пад'ёму праявілася з асаблівай сілай тая наймацнейшая зьлітнасьць, якую мае наша партыя і савецкая ўлада з працоўнымі нашага краю.

Усе гэтыя посьпехі былі-б немагчымы без таго найвялікшага энтузіязму, бяз тэй вялізарнай ініцыятывы, якую праявіла рабочая кляса; усе гэтыя нашы найвялікшыя дасягненьні былі-б немагчымы, калі-б наша партыя не разгарнула ў найглыбейшых нетрах працоўных самакрытыку, калі-б рабочая кляса не стварыла новых форм соцыялістычнага будаўніцтва, калі-б яна не ажыцьцёвіла ідэі соцыялістычнага спаборніцтва, калі-б яна ня стала разьвіваць ударніцтва гэтых новых мэтодаў сьвядомай комуністычнай працы. На гэтым фоне, дзякуючы існаваўшай у нашым асяродзішчы наймацнейшай зьлітнасьці мы за 2 з паловай гады зрабілі вялізную работу ў справе ўмацаваньня і консолідацыі нашай партыі, ажыцьцяўленьня нашых задач.

Мы разьбілі дашчэнту ня толькі рэшткі троцкісцкіх груп, мы нанесьлі найцяжэйшае паражэньне ўсім правым элемэнтам у нашай партыі.

Але, таварышы, усе гэтыя пасьпехі былі дасягнуты не без таго, каб на розных вучастках фронту клясавага змаганьня ў нас ня было паасобных недахопаў і прарываў.

Паўстае ў апошні час надзвычайна востра пытаньне аб стопроцантным выкананьні промфіпляну, аб далейшым зьніжэньні сабекошту, аб падвышэньні якасьці продукцыі аб палепшаньні рабочага забесьпячэньня. У той-жа час пры практычным правядзеньні шырока разгорнутага процэсу колектывізацыі быў зроблены цэлы рад сур'ёзных політычных памылак ня толькі радавымі таварышамі, але нават паасобнымі адказнымі работнікамі вобласьцяй, а таксама і паасобнымі членамі Цэнтральнага Камітэту партыі.

Мы павінны сягоньня падвесьці балянс усёй нашай політыцы. У сьвятле накопленага намі дасьведчаньня мы павінны будзем сягоньня вызначыць, ці правільнай была генэральная лінія партыі. Калі падагуліць зараз усе тыя пытаньні, якія ў гэтыя два з паловаю гады стаялі ў цэнтры нашай увагі, мы ўбачым, што гутарка ідзе аб трох вузлавых момантых усёй міжнароднай і нашай унутранай політыкі. Гэта—пытаньне аб сусьветным, капіталістычным крызісе, пытаньне аб нашым пяцігадовым пляне, пытаньне аб пераходзе ад політыкі абмежаваньня кулацтва да політыкі ліквідацыі яго, як клясы, на аснове суцэльнай колектывізацыі. Гэтыя пытаньні нельга аддзяляць адно ад аднаго, бо, паколькі эканомічны крызіс аслабляе цяпер позыцыі сусьветнай буржуазіі, зусім зразумела, што ўзмацняюцца позыцыі міжнароднага пролетарыяту, а значыцца ўзмацняюцца позыцыі краю пролетарскай дыктатуры, і, з другога боку, паколькі мы ў нашым краі за апошнія два з паловай гады дабіліся найвялікшых посьпехаў, мы ўмацавалі цяпер позыцыі ўсяго сусьветнага рэволюцыйнага руху, мы стварылі ўсе прадпасылкі для пераходу ў контр-наступленьне на фронце міжнароднага клясавага змаганьня.

2. Сусьветны эканомічны крызіс

Я пераходжу да першай часьці майго дакладу, да пытаньня аб сусьветным крызісе.

XIV партыйны зьезд характарызаваў тагачаснае сусьветнае становішча, як пэрыод больш або менш доўгай „перадышкі“, якая абярнулася ў цэлым у пэрыод, так званага, „мірнага сужыцьця СССР з капіталістычнымі дзяржавамі“. Але ўжо XV зьезд павінен быў устанавіць, што, ня гледзячы на праведжаную капіталізмам тэхнічную рэконструкцыю, намячаецца развал капіталістычнай стабілізацыі. Сусьветны эканомічны крызіс, які абазначыўся на выходзе мінулага году, яскрава апраўдаў аналіз даны XV парт. зьездам, а пасьля рашэньнямі Цэнтральнага Камітэту нашай партыі і рашэньнямі прэзыдыуму ВКП.

Сусьветны эканамічны крызіс падводзіць цяпер агул тым дыскусіям і спрэчкам, якія мы мелі ў Камуністычным Інтэрнацыянале і, у прыватнасьці, унутры нашай партыі па пытаньні аб характары капіталістычнай стабілізацыі.

Вы памятаеце, таварышы, што ўжо ў момант VI Сусьветнага конгрэсу пачалі раздавацца галасы, аб тым, што, у выніку тэхнічнай рэконструкцыі, якую ажыцьцяўляе капіталізм, у выніку падвышэньня продукцыйнай моцы яго гаспадарчага апарату, капіталістычная стабілізацыя стала больш моцнай. Ужо на VI Сусьветным конгрэсе ў тую рэзолюцыю, якую ўнёс т. Бухарын па асноўным пытаньні—аб ацэнцы бягучага моманту,—руская дэлегацыя павінна была ўнесьці сур'ёзную і значную папраўку. Сусьветны капіталізм пераступіў праз даваенны ўзровень, сусьветная тэхніка зрабіла значныя дасягненьні, але на аснове гэтага факту, гаварылі мы, абвастраюцца ўсе зьнешнія і ўнутраныя супярэчнасьці капіталізму, бо нарастае крызіс капіталістычнага перавытворства. Мы лічылі, што пэрыод тэхнічнай рэконструкцыі ў разьвіцьці капіталізму будзе ў той-жа час крыніцаю новых найвялікшых конфліктаў як на ўнутранай, так і на міжнароднай арэне.

Сусьветны эконамічны крызіс пацьвердзіў той аналіз становішча сусьветнага капіталізму, які быў даны нашым Цэнтральным Камітэтам і з якога выплывалі асноўныя тактычныя устаноўкі ва ўсёй лініі Комуністычнага Інтэрнацыяналу.

Той крызіс, які перажывае цяпер капіталістычная гаспадарка, зьяўляецца сур'ёзным патрасеньнем ня толькі эконамічнага, але і політычнага парадку.

Не забывайце, таварышы, што П.-А. Зл. Ш. былі ў апошняе дзесяцігодзьдзе станавым хрыбтом усёй капіталістычнай стабілізацыі. П.-А. Зл. Ш.—гэта 50% усяго сусьветнага вытворства, гэта 70% усёй нафты, гэта 90% усяго аўтомобільнага транспорту. Амэрыка пасьля вайны іграла кіраўнічую ролю ва ўсёй сусьветнай капіталістычнай гаспадарцы. Цяперашні сусьветны крызіс наносіць удар ня толькі сусьветнаму капіталізму, але і сусьветнаму рэформізму.

Сусьветны рэформізм орыентаваўся у першыя пасьляваенныя гады на 14 пунктаў програмы Вільсона. У пэрыод капіталістычнай стабілізацыі сусьветны рэформізм высунуў лёзунг „амэрыканізацыя“ рабочага руху. Як галодныя сабакі, лісьліва пaглядалі соцыял-дэмократы ўсіх масьцей і адценьняў на Амэрыку, прабуючы перанесьці у яе практыку клясавага „супрацоўніцтва“ і фашызацыі рабочага руху.

Адначасна з фашызацыяй рабочага руху, адначасна са спробай амэрыканізацыі яго, сусьветная соцыял-дэмократыя разгарнула шалёную агітацыю супроць СССР, імкнучыся скомпромэтаваць соцыялістычнае будаўніцтва ў нашым краі.

І вось цяпер, вастрэй чым калі-небудзь, стоўкваюцца паміж сабой на сусьветнай арэне дзьве сыстэмы: з аднаго боку, капіталістычны сьвет, на чале якога стаіць амэрыканскі імпэрыялізм, а другога боку—будуючыйся соцыялізм—наш пяцігадовы плян. І цяпер становіцца фактам сусьветнага гістарычнага значэньня перамога нашага пяцігадовага пляну. У гэтым змаганьні адбываецца цяпер праверка ўсёй політыкі нашага Цэнтральнага Камітэту.

Калі прасачыць, як разьвіваўся амэрыканскі крызіс, дык мы можам адзначыць тут тры асноўныя стадыі: папершае, кастрычнік 1929 году, калі на Нью-Ёркскай біржы ўзьнікла паніка, калі акцыі пакаціліся ўніз, калі пад руйнаваньне падпаў рад дробных і сярэдніх трымальнікаў акцый, паміж тым, як буйны капітал, прадугледзеўшы падзеж, вышаў з біржы загадзя, пачынаючы яшчэ з лета 1929 году.

Калі разразіўся амэрыканскі крызіс, эўропэйска-капіталістычны друк уздыхнуў з палёгкай—нарэшце-ж амэрыканскай гегемоніі нанесен удар. І Амэрыцы прыдзецца крыху пацісьнуцца таксама, як і Эўропе. Капіталы пачнуць адплываць назад з Амэрыкі ў Эўропу. Эўропе, моў, будзе лягчэй, нарэшце-ж пачне падаць дысконтна-ссудны процант.

Не прайшло і некалькі месяцаў—і верна, дысконтна-ссудны процант зьнізіўся, але ў той-жа час яшчэ больш абвастрыўся крызіс у эўропэйскіх капіталістычных краёх.

Другую фазу разьвіцьця амэрыканскага крызысу нельга аддзяляць ад першай фазы, бо біржавы крызіс несумненна вырас на аснове найглыбейшага вытворчага крызісу. Неўзабаве пасьля краху на Нью-Ёркскай біржы выступілі асабліва востра наповерх і тыя процэсы, якія адбываліся ў гаспадарчым жыцьці Амэрыкі і абумовілі ўзьнікненьне біржавой панікі. Лічбы, узятыя з офіцыяльных амэрыканскіх выданьняў, лепш за ўсё ілюструюць гэта становішча. Мы бачым, што яшчэ ў ліпені мінулага году вытворчы індэкс быў ровен 108, у жніўні—106, у сьнежні ён дайшоў да найбольш нізкай лічбы—89.

Трэцяя фаза, гэта некаторае лёгкае паляпшэньне, якое зьмянілася ізноў цяжкой дэпрэсіяй. Мы наглядалі ў лютым і сакавіку некаторае падвышэньне вытворства, а потым рэзкі заняпад у красавіку і ў пачатку мая.

Ня гледзячы на ўсё оптымістычнае чараўніцтва пана Гувэра і ўсіх амэрыканскіх буржуазных эконамістаў, крызіс у Амэрыцы ўсё больш паглыбляўся. І ў той-жа час станавілася зусім відавочна, што гэты крызіс ня ёсьць чыста амэрыканская зьява. Амэрыканскі крызіс наймацнейшым спосабам зьвязаны з крызісам усёй капіталістычнай гаспадаркі ў іншых часьцях сьвету. Ён зрабіў аграмадны ўплыў на гаспадарку капіталістычных краёў, рэзка пагоршыўшы крызісную кан'юнктуру, існаваўшую там яшчэ да амэрыканскага крызісу.

Крызіс у Эўропе, які атрымаў такі моцны таўчок з Амэрыкі ў бок свайго далейшага разьвіцьця, быў абумоўлен агульнай хваробай капіталістычнай сыстэмы—у Эўропе на яго разьвіцьцё мае ўплыў і рад іншых фактараў: пасьляваенная раздробленасьць усходняй часьці капіталістычнай Эўропы, фэўдальныя перажыткі ў такіх краёх, як Польшча і Балканы, а таксама фінансавая залежнасьць капіталістычнай гаспадаркі цэлага раду дзяржаў, пацярпеўшых паражэньне ў часе вайны ад сусьветнага імпэрыялізму.

Гэтыя прычыны абвастрылі разьвіцьцё эўропэйскага крызісу. Калі мы паглядзім на разьвіцьцё за апошнія месяцы хоць-бы нямецкай гаспадаркі, мы павінны будзем канстатаваць, што і па вугалі, і па сталі нямецкая гаспадарка ідзе ўніз: павялічваецца ў Нямеччыне колькасьць безпрацоўных, якая, паводле офіцыяльнай статыстыкі, ужо выражаецца лічбай каля 3 млн. чалавек.

Калі мы возьмем такі край, як Англія, то і тут мы наглядаем, што ён ахоплен пачынаючымся самым цяжкім крызісам. Я ня буду прыводзіць тут падробна лічбаў, але спашлюся толькі на аўтарытэтную думку аднаго чалавека, якому ў пытаньні аб становішчы ў Англіі мы ня маем падставы ня верыць, гэта міністар без портфэлю, які ўзваліў на сябе непасільную місію змаганьня з безпрацоўем пан Томас,—сакратар саюзу чыгуначнікаў.

Вядома, што лік офіцыяльна зарэгістраваных безпрацоўных у Англіі дайшоў да 1.739.000 чалавек. За год існаваньня ўраду Макданальда лік беспрацоўных павялічыўся ў Англіі на 600.000 чалавек.

Міністар змаганьня з безпрацоўем Томас, які яшчэ нядаўна суліў палепшаньне эконамічнай кон'юнктуры, 19 мая ў палаце абшчын павінен быў прызнаць: „становішча кепскае, яно робіцца ўсё горшым, прычыны безпрацоўя нельга зьнішчыць сродкамі, што знаходзяцца ў руках чалавека, і таму нападкі на ўрад зусім лішнія“.

Суцешыць ён мог толькі паведамленьнем, што „у Нямеччыне безпрацоўе за год вырасла з 3 да 4 млн. чалавек, што ў Амэрыцы 21 проц. членаў профсаюзаў ня маюць работы, што ў Аўстраліі 14, а ў Канадзе 10 проц. безпрацоўных, а ў Японіі за адзін апошні тыдзень зачынілася 935 фабрык“.

Таварышы, калі пан Томас вымушаны цешыцца тым, што ў іншых капіталістычных краёх яшчэ горш, то гэта вясёлая міна на яго твары падобна да гумару шыбельніка. З вуснаў Томаса мы чуем прызнаньне таго надзвычай цяжкага становішча, у якім знаходзіцца цяпер ангельскі капіталізм.

Возьмем край, які зьяўляецца нашым непасрэдным суседам, Польшчу. Польшча зьяўляецца тыповай дзяржавай Усходняй Эўропы, дзе ў наяўнасьці і перажыткі фэўдалізму, і фінансавая залежнасьць ад больш магутнага імпэрыялізму, дзе ёсьць у наяўнасьці надзвычай распухшы дзяржаўны політэйска-адміністрацыйны апарат, з нязносным бюджэтным цяжарам, узваленым на плечы працоўных мас. Польшча—гэта асколак усёй Вэрсальскай сыстэмы, бо тут можна прашчупаць становішча ўсяго міжнароднага капіталізму. Якаво становішча польскай гаспадаркі ў цяперашні час? Агульны паказальнік цэн акцый у 1928 г. складаў 106 проц., у 1930 г.—55 проц.—за два гады зьніжэньне амаль на 50 проц. У лютым 1930 г. здабыча вугалю ў параўнаньні з папярэднім месяцам паменшылася на 21 проц., і нафтай—тая-ж карціна. У мэталюргіі, у тэкстыльнай прамысловасьці—усюды мы павінны канстатаваць пагоршаньне кан'юнктуры. 91 проц. тэкстыльных прадпрыемстваў у Польшчы ня маюць нагрузкі, або маюць вельмі нязначную нагрузку.

Для таго, каб даць нам ясную карціну становішча ў Польшчы, я спашлюся на заяву зноў такі нашага клясавага ворага. Я маю на ўвазе артыкул, што паявіўся 28 красавіка г. г. у органе Корфанты ў Верхняй Сылезіі „Полёнія“. Вось што піша орган Корфанты цяпер аб становішчы польскага капіталізму:

— „Больш 300 000 чалавек напружана шукаюць хлеба і работы. Другія 300.000 працуюць толькі некалькі дзён у тыдзень. Буйныя прамысловыя цэнтры прадстаўляюць сабою могільнік. Лодзь мёртвая, Беласток памірае Беласток задыхаецца. Жалезная прамысловасьць у Польшчы, у прыватнасьці ў Сылезіі, прадстаўляе няшчасны від, з вугалем кепска, вельмі кепска. Унутраны і зьнешні рынак усё больш звужаецца“.

І далей:

„У Польшчы ўсе азлоблены, расчараваны, поўны сумненьня. Некаторыя проста пылаюць помстаю, ня могуць дачакацца моманту рэваншу, Пад паверхняй гудзяць агні, жывем на вулькане, тым больш небясьпечным, што ня відаць паляпшэньня ні ў політычных, ні ў гаспадарчых адносінах“.

Калі пры такім становішчы польскі імпэрыялізм робіць спробы шляхам провокацыі стварыць напружаныя адносіны з нашым Савецкім Саюзам, запалохаць нас пагрозаю вайны, то мы, безустанку рыхтуючы адпор польскаму імпэрыялізму, можам яму разам з тым і напомніць, што ў яго ня зусім супакойны і спрыяючы для вайны тыл.

Крызіс ахапіў ня толькі Амэрыку і Эўропу. Ён цяжэй за ўсё праявіўся на краёх мала разьвітых у эконамічных адносінах, на калёніях і паўкалёніях. Разьвіцьцю крызісу тут дапамагаў рад спэцыфічных умоў і перш за ўсё існуючы ў гэтых краёх монокультурны тып гаспадаркі. Сусьветны імпэрыялізм падтрымлівае такі падзел працы паміж калёніямі, які забясьпечвае яму эконамічнае панаваньне і асуджае калёніі на поўную эконамічную залежнасьць ад яго. Кожная калёнія вытварае той ці іншы лік сельска-гаспадарчай сыравіны, патрэбнай для вытворства Мэтраполіі. Так. 80 проц. вывазу Эгіпту складае бавоўна Індыя вывозіць таксама бавоўну, джут, масьлянічныя расьліны, Бразілія—каву, Чылі—салетру і г. д. Калі сусьветны капіталізм перажывае крызіс, адразу-ж пачынае цярпець крах і вытворства гэтых соцень мільёнаў дробных уласьнікаў, засяляючых залежныя краі і працуючых для сусьветнага рынку. Цяжкасьць крызісу ў калёніях і поўкалёніях павялічваецца яшчэ таму, што там пераважна ўжываецца срэбная валюта. Вартасьць срэбра дае ў апошнія гады самую нізкую лічбу за апошніх сто гадоў. Таму мэксыканская срэбная прамысловасьць перажывае цяпер надзвычай цяжкі крызіс. У Кітаі ў цяперашні час ня толькі ня плацяць процантаў за срэбра, наадварот, укладчыкі, што ўносяць у банк срэбра, павінны плаціць процант банкам. Зьніжэньне вартасьці срэбра надзвычай цяжка адбіваецца цяпер і на індыйскай валюце, рупіі. І гэта другая прычына, якая паглыбляе крызіс у калёніях і поўкалёніях.

Але асноўнай прычынай таго чаму крызіс у калёніях і поўкалёніях прымае такія барбарскія формы, зьяўляюцца галоўным чынам існуючыя ў калёніях навейшыя драпежніцкія формы капіталістычнай эксплёатацыі, якая разьвіваецца на поўрабскай, поўфэўдальнай і фэўдальнай аснове.

Вось гэтыя тры тыпы краёў даюць агульны малюнак стану ўсёй сусьветнай капіталістычнай гаспадаркі. З растучага ва ўсім капіталістычным сьвеце крызісу выплывае рад сур'ёзных вынікаў, якія абрысоўваюцца перад намі ў відзе намячаючыхся контураў аграмаднейшых зрухаў у міжнароднай політыцы, найвялікшых зрухаў у сусьветным рабочым руху. Ужо цяпер на нашых вачох надзвычай абвастраецца змаганьне за рынкі ва ўсім сьвеце—адбываецца тое, што мы прадракалі і раней. Гэта змаганьне разьвіваецца перш за ўсё паміж Злучанымі Штатамі і Вялікабрытаніяй у Паўднёвай Амэрыцы, яно пачынае разгарацца ў Ангельскіх доміньёнах, яно пранікае ў Кітай, і заўтра яно пачне разьвівацца ў Індыі.

Цяпер Паўночна-Амэрыканскія Злучаныя Штаты ўступаюць у паласу актыўнай імпэрыялістычнай політыкі. Не забывайце-ж, таварышы, што амэрыканскі вываз да гэтага году быў роўны ўсяго 8 проц. нацыянальнай продукцыі Амэрыкі. Павышэньне амэрыканскага вывазу хоць-бы на 1 проц. па сваёй удзельнай вазе на сусьветным рынку было-б роўна, напрыклад, усяму ангельскаму ўвозу ў краі Паўднёвай Амэрыкі. Гэту фазу ў разьвіцьці амэрыканскага капіталізму прадракаў Ленін яшчэ ў 1921 г. у сваёй прамове аб концэсіях. Калі да гэтага часу Амэрыка грабіла многія краі, прыкрываючыся лёзунгамі свабоды мораў, політыкі адчыненых дзьвярэй і г. д., то цяпер яна становіцца з году ў год найбольш агрэсыўнай дзяржавай у змаганьні за новы перадзел сьвету. Змаганьне за сусьветную гегемонію паміж Паўночнымі Амэрыканскімі Злучанымі Штатамі і Вялікабрытаніяй абвастраецца цяпер усюды. Гэта змаганьне знайшло сваё яркае адлюстраваньне і на Лёндонскай конфэрэнцыі, што нядаўна адбывалася. Макдональд сабраў Лёндонскую конфэрэнцыю для таго, каб апраўдацца перад рабочымі. Як вядома, урэгуляваньне адносін з Амэрыкай было адным з пунктаў выбарчай програмы Рабочай Партыі. Мы прадракалі, што Лёндонская конфэрэнцыя зьявіцца крыніцай далейшага абвастрэньня супярэчнасьцяй. Мы прадбачылі, што ў Лёндане толькі ўзмоцняцца позыцыі а м э р ы к а н с к а г а імпэрыялізму.

Працяг глядзі на 3-й стар.

XIII зьезд КП(б)Б

Ад XV—да XVI зьезду УсеКП(б)

Даклад Д. З. Мануільскага на XIII зьездзе КП(б)Б

Міжнароднае становішча

(Працяг. Пачатак глядзі на 2-й старонцы)

Калі гістарычна прасачыць разьвіцьцё амэрыканскага і ангельскага імпэрыялізму, то мы можам бачыць як з году ў год цэнтр сусьветнай політыкі перасуваецца з Вялікабрытаніі ў Паўночна-Амэрыканскія Злучаныя Штаты, як разам з гэтым адбываецца перасуваньне і ваеннай магутнасьці ў бок Амэрыкі. Політыка брытанскай імпэрыі, якая некалі зводзілася да таго, што ангельскі флёт павінен быць роўным двум злучаным флётам іншых імпэрыялістычных дзяржаў, гэта політыка, якая характарызавала сабою ўвесь пэрыод даваеннага разьвіцьця, пацярпела ўжо паражэньне. Яшчэ ў 1921 г., зараз-жа пасьля вайны, у Вашынгтоне Англія павінна была прызнаць нявыгодны для яе парытэт у буйных лінейных суднах. Мала таго, у Вашынгтоне быў нанесены Амэрыкай і другі ўдар ангельскай морскай магутнасьці. Прынцып парытэту мог быць параліжаваны Англіяй праз заключэньне саюзу з Японіяй, каб злучаны флёт абедзьвюх дзяржаў быў мацней за амэрыканскі флёт. Але і ў гэтым пытаньні Амэрыка дабілася ў Вашынгтоне паражэньня Англіі, настаяўшы на разрыве морскага саюзу Англіі з Японіяй.

Уся амэрыканская політыка зводзілася ў гэты пэрыод да таго, каб з аднаго боку, дабіцца парытэту, а з другога—разьбіць саюз Англіі з Японіяй. Англія прабавала яшчэ супраціўляцца амэрыканскаму імпэрыялізму па знакамітай Жэнэўскай конфэрэнцыі, якая адбылася год таму назад. Але цяпер бясспрэчна, што амэрыканскі імпэрыялізм вышаў пераможцам са спрэчкі на Лёнданскай конфэрэнцыі. Супярэчнасьці паміж Англіяй і Амэрыкай яшчэ мацней абвастрыліся. Лёнданская конфэрэнцыя бясспрэчна зьяўляецца крокам да новай найвялікшай вайны, якой не перажываў яшчэ капіталістычны сьвет.

Мы бачым, таварышы, што ўзьнікненьне і разьвіцьцё сусьветнага крызісу пацягнуўшае за сабой далейшае абвастрэньне імпэрыялістычных супярэчнасьцяй, пацьвердзіла правільнасьць рэзолюцыі ХУ Партзьезду, пацьвердзіла цалкам нашу правату ў спрэчках з прымірэнцамі і правымі ў пытаньні аб капіталістычнай стабілізацыі, апраўдалі рашэньні Прэзыдыуму Выканкому Комінтэрну, прынятыя ў поўнай згодзе з позыцыяй Цэнтральнага Камітэту.

Абвастрэньне знадворных супярэчнасьцяй імпэрыялізму знаходзіць сваё выражэньне і ў памацненьні мытнай вайны паміж капіталістычнымі краямі. Усюды назіраецца тэндэнцыя да павышэньня мытных ставак, да закрыцьця граніц, якая надзвычай памацняецца пад уплывам сусьветнага крызісу. Урад Брюнінга ў Нямеччыне павышае тарыфы на цэлы рад прадуктаў больш чым на 500 проц. Уводзяцца павышаныя тарыфы на сельска-гаспадарчыя прадукты. Мы бачым, як соцыял-дэмократы, выступаўшыя да вайны за прынцып свабоднага гандлю, капітулююць і ў гэтым пытаньні цяпер перад буйнымі аграрыямі. Мытная політыка протэкцыянізму становіцца ў Англіі ня толькі політыкай консэрватараў. Мы бачым, што гэтую політыку пачынаюць падтрымліваць і лібэралы, і рад членаў з Рабочай Партыі. Няма цяпер ніводнага краю, не ахопленага мытнай вайной.

Вось, таварышы, яшчэ адзін з вынікаў сусьветнага крысісу, які падрыхтоўвае новы конфлікт, што насьпявае паміж імпэрыялістычнымі дзяржавамі. Не гадаючы аб тэрмінах сусьветнай вайны, умацоўваючы ў сябе позыцыі пролетарскай дыктатуры, узмацняючы штогадзінна абароназдольнасьць пролетарскай дзяржавы, мы ўцэўнена глядзім на тое, як ход гістарычнага разьвіцьця капіталізму працуе на нас, падгатаўляючы сілы міжнароднага пролетарыяту для змаганьня за сваё вызваленьне, для змаганьня супроць вайны, для змаганьня за абярненьне вайны імпэрыялістычнай у выпадку, калі яна разразіцца, у вайну грамадзянскую.

3. Капіталістычны сьвет і СССР

Але, таварышы, асноўная супярэчнасьць на цяперашняй сусьветнай арэне, гэта нясумнена супярэчнасьць паміж сьветам будуючагася соцыялізму і сьветам капіталізму. Што новага паявілася ў гэтым абсягу ў апошні час у сувязі з нашым пяцігадовым плянам? Супярэчнасьць паміж СССР і капіталістычным сьветам выплывае перш за ўсё з наяўнасьці двух розных сыстэм, з розьніцы гаспадарчага і політычнага ўкладу ў абодвых лягерах. Але, калі ў мінулым гэта супярэчнасьць жывілася яшчэ тым, што са сфэры сусьветнай гаспадаркі выпаў вялікі рускі рынак, то цяпер паявіўся новы фактар, які паглыбляе прорву паміж Савецкім Саюзам і капіталістычным сьветам. Гэта факт выкананьня намі пяцігадовага пляну.

Капіталістычны сьвет прадбачыць выступленьне Савецкага Саюзу ў бліжэйшыя гады, як магутнай экспартнай дзяржавы, якая будзе біць капіталізм у самых слабых яго зьвёнах. у пытаньні аб рынках. Калі здань комунізму да гэтага часу брадзіла ў відзе нашых комуністычных партый па Эўропе, то цяпер яна маячыць яшчэ перад задыхаючымся ў абцугох крызісу сусьветным капіталізмам у відзе савецкага тавару.

Капіталістычны сьвет гэтую небясьпеку, таварышы, улічвае. Праўда, тут не абыходзіцца без шантажу з боку капіталістаў Даволі сказаць, што напрыклад. з год таму назад. калі мы выкінулі на рынак якіх-небудзь 30 тысяч тон збожжа, увесь ангельскі і канадзкі буржуазны друк падняў шалёнае выцьцё з повад у таго, што становішча канадзкіх фэрмэраў зьяўляецца цяжкім у сувязі з гэтым вывазам 30 тысяч тон збожжа. Сусьветны капітал прабуе біць па нашым імпартна экспартным пляне. Ён ставіць сабе задачу сарваць што-б там ні сталася наш імпартна-экспартны плян. І за апошнія месяцы мы бачым, як сыстэматычна, упарта з краю ў край праводзіцца кампанія зрыву нашага экспарту. Вазьмеце вы, напрыклад, змаганьне за рускую запалку: вы ведаеце, якую ролю адыграў у гэтым змаганьні „Кругер-концэрн", які паступова выціскае нашу запалку ня толькі з Нямеччыны на падставе пагадненьня, што адбылося каля году таму назад з соцыял-дэмократычным урадам, ён выціскае з рынкаў Бліжэйшага Ўсходу.

Ці вы возьмеце любы від экспартнага тавару, вы ўбачыце, што ўсюды капіталізм прабуе павесьці супроць яго вайну. Гэта змаганьне супроць нашага экспарту стварае нам значныя затрудненьні.

Не забывайце, што яшчэ зусім нядаўна мы вымушаны былі абмяжоўваць нашае тэкстыльнае вытворства з-за гэтых спроб сарваць наш экспартна-імпартны плян, пабудзіўшы нас скараціць увоз бавоўны.

Паміма гэтых экономічных мер змаганьня з намі. супроць нас пускаюць ў ход і іншыя сродкі. Мы мелі справу ня толькі са спробай стварэньня фінансавай блёкады і абмежаваньня крэдытаў. Супроць нас усе сродкі добрыя. Усе вы памятаеце працэс фальшываманэтчыкаў у Бэрліне, працэс Савелія Літвінава ў Парыжы. Судовымі прыгаворамі ва ўсіх гэтых працэсах сусьветны капітал устанаўляе новы ўстой сваёй моралі: у змаганьні супроць Савецкага Саюзу і падробка вэксалёў, і фабрыкацыя фальшывых грошай зьяўляюцца зусім дапушчальнымі і законнымі сродкамі. Усе гэтыя мерапрыемствы характарызуюць надзвычайнае абвастрэньне змаганьня сусьветнага капіталу супроць СССР і абумоўліваць рад нашых затрудненьняў.

І калі, таварышы, у гэтых умовах лютага наступленьня сусьветнага капіталу на нас, наш Цэнтральны Комітэт, ня гледзячы ра панічныя крыкі, што чуліся з розных бакоў, ня гледзячы на ўсякія пропозыцыі аб абмежаваньні манаполіі зьнешняга гандлю, дабіліся таго. што мы ўтрымалі нашы позыцыі на зьнешнім рынку і ажыцьцяўляем наш экспартна-імпортны плян, то гэта ёсьць адно з самых сур'ёзных дасягненьняў нашага Цэнтральнага Камітэту. Бяз усякага нэрваваньня, у самых трудных умовах мы выконваем наш плян.

Мы мелі ў гэтыя гады і непасрэдны конфлікт з капіталістычным сьветам. Нядаўна нам прышлося адбіваць націск на Усходня-Кітайскай чыгунцы. Я падробна ня буду спыняцца на гэтым пытаньні, гэтыя падзеі яшчэ сьвежы ў нашай памяці.

Вы памятаеце тое выцьцё, якое падняў тады сусьветны капіталістычны друк аб рускім імпэрыялізьме. Яму ўторыла міжнародная соцыял-дэмократыя. Зграя пана Троцкага таксама залямантавала аб тым. што мы праводзім імпэрыялістычную політыку. Але наш Цэнтральны Камітэт праводзіў цьвёрдую палітыку, ён увесь час падтрымліваў політыку міру, але ён рабіў гэта апіраючыся на баяздольнасьць нашай Чырвонай арміі, якая стаяла зоркім вартаўнікам на нашых граніцах. Дужыя ад падтрыманьня міжнароднай рабочай клясы, апіраючыся на давер'е да нашай політыкі міру найшырэйшых мас, мобілізуючы актыўнасьць і рэволюцыйны энтузіязм працоўных нашага краю, мы ліквідавалі пагражаючае становішча на Далёкім Усходзе. Наша політыка ўзяла верх. Мы дабіліся станоўчых вынікаў дзякуючы нашай цьвёрдай політыцы.

Якавы нашы далейшыя задачы ў абсягу міжнароднай політыкі і нашых узаемаадносін з капіталістычнымі дзяржавамі? Узмацняць што-б там ні сталася сілу нашай Чырвонай арміі—гэта першая асноўная задача, якую мы павінны і ў далейшым выканаць. Другая задача—умацаваць што-б там ні сталася монополію зьнешняга гандлю. змагацца за ажыцьцяўленьне нашага экспартна-імпартнага пляну з той жа цьвёрдасьцю, якая была праяўлена і раней нашым Цэнтральным Камітэтам. Трэцяя задача зводзіцца да таго, каб вызваліцца ў абсягу нашага машынабудаўніцтва, вытворства сродкаў вытворства ад залежнасьці капіталістычных краёў, каб разгарнуць у бліжэйшыя гады такое магутнае машынабудаўніцтва, якое цалкам вызвавіла-б нас ад гэтай залежнасьці. Нарэшце, чацьвертая наша задача, непарыўна зьвязаная з першай задачай, зводзіцца да таго, каб узмацняць нашу політыку міру з той жа настойлівасьцю. упэўненасьцю ў сваіх сілах, самаўладаньнем, як мы гэта праводзілі да гэтага часу.

4. Рэволюцыйны ўздым

Я пераходжу да пытаньня аб сусьветным рэволюцыйным руху і аб Комінтэрне. Мы маем у апошні час ня толькі абвастрэньне знадворных супярэчнасьцяй капіталізму, але, што асабліва важна абвастрэньне на аснове разьвіваючагася крызісу ўсіх унутраных супярэчнасьцяй капіталізму. Ужо ў пэрыод XV партыйнага зьезду мы констатавалі гэта няўнікнёнае абвастрэньне, якое павінна было вырасьці ў выніку капіталістычнай рацыяналізацыі. Капіталістычпая рацыяналізацыя лягла цяжкім камянем на плечы рабочай клясы. яна павысіла эксплёатацыю рабочых. яна скараціла заработную плату. яна ў той жа самы час стварыла вагромністую рэзэрвовую армію працы, выціснуўшы цэлыя пласты пролетарыяту з вытворчага процэсу. Капіталістычная рацыяналізацыя зьявілася асновай паляпеньня рабочай клясы. Што прыбавілася з таго часу? Да гэтых асноўных момантаў прыбавіўся новы момант—сусьветны крызіс, нябачаны рост беспрацоўя. У сувязі з гэтым, у сувязі з капіталістычнай рацыяналізацыяй, у сувязі з сусьветным крызісам у сусьветным рабочым руху адбываецца цэлы рад перагруповак. Цяперашні рэформізм і цьперашняя соцыял-дэмократыя. гэта не стары рафармізм. не старая даваенная соцыял-дэмократыя Мы бачым, што старая соцыял-дэмократыя і ранейшая рабочая арыстакратыя зьмяніліся цяпер. Капіталістычная рацыяналізацыя дэквалiфікавала цэлыя пласты рабочай арыстакратыі і стварыла многалікія камандныя пласты майстроў, тэхнікаў, тэхнічны пэрсонал Такаво зьмяненьне соцыяльнай базы соцыял-дэмократыі. У той-жа час соцыял-дэмократыя пашырыла сваю базу за кошт дробна-буржуазных пластоў. І калі соцыял-дэмократы гавораць аб тым, што яны заваёўваюць цяпер тыя пласты, якія ішлі за фашызмам, дык гэта азначае нішто іншае, як тое, што соцыял-дэмократыя, апіраючыся па новыя пласты, сама фашызуецца.

Калі мы паставілі пытаньне аб гэтай фашызацыі соцыял-дэмократаў, Брандлер і компанія закрычалі аб тым, што гэта ёсьць у істоце політыка лаянкі, сваркі, што трэба даць сур'ёзны аналіз стану соцыял-дэмократыі.

Дазвольце прывесьці адну цытату, якая пакажа вам, ці сапраўды соцыял-дэмократы зьяўляюцца партыяй, якая змагаецца, як думаюць правыя. за рэформу, ці гэта партыя пражоглага соцыял-фашызму. Я маю на ўвазе вядомага правадыра італьянскага рэформізму, перайшоўшага да фашыстых-Дэрагону. Вось што ён піша аб програме соцыял-фашызму:

„Сярод пролетарыяту заходніх краёў пранікла пераканаRньне, што ў цяперашні час ня трэба весьці клясавага змаганьня, каб дабіцца некаторых выгад. Рэволюцыйная забастоўка зусім выгнана з програм. Мы маем зусім ясную прымету гэтай зьмены ідэалёгічнай установкі. У Нямеччыне гэта выражаецца ў разьвіцьці рабочых судоў, у перанясеньні вырашэньня буйных конфліктаў у арбітражныя суды. у Англіі гэта знайшло сваё выражэньне ў конфэрэнцыі прамысловага міру, у Францыі—у патрабаваньні парытэтнага кантролю і ў патрабаваньні замацаваньня інстытуту нацыянальнага экономічнага савету ў конституцыі. Капітал і праца ўсё больш пераконваюцца ў тым, што змаганьне пры сучасных умовах прыносіць шкоду для абодвых бакоў,—таму яны аднадушна намагаюцца ўдасканаліць вытворчы апарат і ўвесьці рацыянальныя гаспадарчыя формы. У даным выпадку трыумфуе прынцып адноснага супрацоўніцтва".

Далей ён піша: „розьніца паміж Італіяй і іншымі краямі заключаецца толькі ў тым, што ў той час, як у лібэральных краёх з лібэральным рэжымам самі клясы бяруць у свае рукі ініцыятыву супрацоўніцтва... у нас дзяржава організоўвае супрацоўніцтва кляс, апіраючыся на іх".

Далей ідуць словы найглыбейшага цынізму, якія сьведчаць аб найвялікшым заняпадзе ня толькі італьянскага рэформізму, але і ўсяго міжнароднага рэформізму.

„Калі пераможны фашызм абвясьціў. што ён ажыцьцявіў рэволюцыю, дык мы яму ня верылі. Але потым нам неабходна было зьмяніць свой погляд. Дрэва пазнаецца па яго пладох. Калі на дрэве фашысцкага рэжыму зьявіліся атожылкі корпорацый. тады мы пераканаліся, што мы стаімо перад карэнным пераваротам, аб'ядноўваючым у сабе адзнакі рэволюцыі і рэстаўрацыі.

Мы тады паставілі перад сабою пытаньне. што лепш, павярнуць назад рэволюцыю да яе крыніцы, ці гнаць яе наперад да яе будучыні. Вярнуцца назад да зыходнага пункту—але навошта. каб аднавіць ранейшы профсаюзны хаос і стварыць прадпасылкі для новага пажару, новай грамадзянскай вайны? Якой іншай програмай мы-б змаглі спрачацца супроць фашызму, калі ён у профсаюзнай і соцыяльнай часьці ажыцьцяўляе нашу програму?

Самае меншае, што мы маглі пры такім становішчы рабіць, гэта зьвярнуць у бок, каб даць фашысцкаму экспэрымэнту свабодны шлях разьвіцьця, у надзеі, што ўнутраныя супярэчнасьці фашысцкага руху знойдуць у свой час вырашэньне. Мы, аднак, не маглі здаволіцца тым, каб іграць ролю маўклівага сьведкі. І, такім чынам, мы рашылі прымаць удзел у будаўніцтве корпорацыйнай дзяржавы.

Корпорацыйная дзяржава фактычна для нас зьяўляецца „мастом" да рабочай дзяржавы".

Да гэтага няма чаго дабавіць.

Такім чынам мы бачым, як соцыял-дэмократыя, вытрасшы стары, непатрэбны ёй багаж. усё больш набліжаецца да ідэолёгічных позыцый адкрытага фашызму. Але гэтага мала. Калі гутарка ідзе аб сацыял-фашызьме. трэба мець на ўвазе ня толькі зьмену яе соцыяльнай базы, ня толькі фашызацыю яе ідэолёгіі, але цеснае зрастаньне яе з дзяржаўным і прадпрыемніцкім апаратам буржуазнай дзяржавы.

У Францыі колькасьць забастоўшчыкаў за 1929 год, у параўнаньні з 1928 годам, павялічыліся з 222.000 да 431.000, амаль удвая. у 1930 г. за чатыры месяцы было 350 забастовак з 138.238 удзельнікамі супроць 232 забастовак з 73.000 удзельнікаў за гэты-ж час у 1929 годзе. У Англіі ў 1928 г. было 124.000 бастуючых, а ў 1929 г. ужо 534.000.

Выключна вялікае значэньне мае новы значны рост забастовачнага руху ў Кітаі (1928 г.—400.000 забастоўшчыкаў, у 1929 г.—750.000) і якраз, іменна ў буйнейшым пролетарскім цэнтры, у Шанхаі.

Забастовачнае змаганьне ў Румыніі і ў Грэцыі ў апошні час было сапраўды масавым, яно мела ярка выражаны політычны характар змаганьня супроць фашысцкіх урадаў гэтых краёў. У Грэцыі ў двух гарадох забастоўкі канчаліся захватам рабочымі ўлады на некалькі гадзін.

Але, апрача таго, пролетарыят дае выхад сваёй рэволюцыйнай энэргіі ў другіх формах клясавага змаганьня, у тым ліку і ў узрастаючай колькасьці масавых боек з узброенай паліцыяй за вуліцу, прычым у Гамбургу гэтыя бойкі ўжо прывялі аднойчы да стыхійнай пабудовы барыкад.

Доказам абвастрэньня клясавага змаганьня і росту рэволюцыйнага ўздыму зьяўляецца ўсё больш рэзка выражаны політычны характар забастовачнага змаганьня. Мы можам адзначыць усё больш частыя выпадкі забастовак солідарнасьці (Францыя). забастовак для абароны рэволюцыйных організацый (Румынія), забастовак з патрабаваньнем выдаленьня з заводу найбольш ненавісных соцыял-фашыстых (Нямеччына, Францыя).

Нарэшце, мы бачылі ўсюды бурны рост руху беспрацоўных. Пераважаючая большасьць цяперашніх беспрацоўных толькі нядаўна пакінула прадпрыемствы і захавала сувязь з рэволюцыйным змаганьнем занятых на вытворчасьці рабочых. Асноўная, першая і прымітыўная форма змаганьня беспрацоўных—дэмонстрацыя па вуліцах Таму рост руху беспрацоўных суправаджаецца аграмадным ростам рэволюцыйных дэмонстрацый беспрацоўных разам з занятымі на вытворчасьці рабочымі. Рух беспрацоўных ня могуць не падтрымліваць цяпер мільёны занятых на вытворчасьці пролетараў, якія, у сваю чаргу. працуюць няпоўны тыдзень і знаходзяцца пад пастаяннай пагрозай звальненьня.

Соцыял-дэмократыя кінула, як вы ведаеце, у свой час лёзунг міру ў прамысловасьці, лёзунг гаспадарчай дэмократыі. Гэта зложыла альфу і омэгу ўсёй сучаснай пляцформы соцыял-дэмократыі. Ці ўдалося ёй у якой-небудзь ступені ажыцьцявіць гэты лёзунг? Мінулы пэрыод паказаў адваротнае. Мы бачым, што клясавае змаганьне абвастраецца ва ўсім сьвеце. У Англіі пытаньне пасьля прыходу да ўлады рабочага ўрада. г. ё. тых, хто кінуў лёзунг „міру ў прамысловасьці", мы наглядаем узмацненьне клясавага змаганьня, рост колькасьці забастовак і колькасьці ўдзельнікаў у іх.

Мы бачым у апошні час, як на наступленьне сусьветнага капіталу рабочая кляса адказвае контр-наступленьнем. Расьце рэволюцыйны ўздым ва ўсім сьвеце. Аб гэтым сьведчыць рост забастовачнага руху ў капіталістычных краёх у апошнія гады.

Мы бачым. такім чынам, таварышы, што ўстаноўка нашага Цэнтральнага Камітэту на няўнікнёнае абвастрэньне клясавага змаганьня ва ўсім сьвеце, на рост рэволюцыйнага руху была правільная, што гэта ўстаноўка нашла сваё апраўданьне ў радзе цыфр і фактаў агромнага міжнароднага значэньня. Гэта важна адзначыць цяпер, калі мы робім праверку правільнасьці лініі і ўсёй політыкі нашага Цэнтральнага Камітэту.

5. Кітай і Індыя

Аб росьце рэволюцыйнага руху сьведчаць тыя падзеі, якія разыгрываюцца цяпер у двух асноўных пунктах колёніяльнага сьвету—у Кітаі і ў Індыі. Калі пасьля першага часовага паражэньня кітайскай рэволюцыі мы ў Комінтэрне гаварылі аб тым, што гэта паражэньне часовае, што не за гарамі той час, калі кітайская рэволюцыя зноў войдзе ў фазу ўздыму, троцкісты нам пярэчылі, што паражэньне кітайскай рэволюцыі доўгачаснае, што гэта на рад гадоў спыніць рэволюцыйны рух у Кітаі.

Паглядзім, аб чым гавораць цяпер факты. Вы ведаеце, што ў месяцы паўднёвых провінцыях Кітаю ў многіх мясцох утварыліся Саветы, што з 773 паветаў 10 паўднёвых провінцый, 162 паветы абхоплены паўстанскай вайной, а ў руках 13 корпусаў кітайскай Чырвонай арміі знаходзіцца 127 паветаў, у якіх утворана савецкая ўлада. У бліжэйшыя дні павінен адбыцца 1-ы зьезд Саветаў Кітаю. (Бурныя апладысмэнты).

Працяг гл. на 4-й старонцы

XIII зьезд Комуністычнай партыі (бальшавікоў) Б л русі

АД XV—ДА XVI ЗЬЕЗДУ УсеКП(б)

Даклад Д. З. Мануільскага на XIII зьезьдзе КП(б)Б

Міжнароднае становішча

Працяг. Пачатак гл. на 2-й і 3-й старонцы)

Вы памятаеце пакутную эпопэю Чу-Дэ, Мау-Дэ-Дюна, якія аказаліся прымушанымі пайсьці ў горы. Гэтыя атрады, у якіх сапраўды можа навучацца цяпер рэволюцыйнай стратэгіі і тактыцы—наш партыйны маладняк у Кітаі. Цяпер разрозьнены паўстанцкі рух расьце, зьліваючыся ў адзіны магутны націск на клясавага ворага, ён налічвае такія бязумоўныя трофэі як утварэньне савецкай улады ў 127 паветах. Гэта значыць, што перад кітайскім рэволюцыйным рухам устае ўжо рад пытаньняў ня толькі тэорэтычнага, але і практычнага парадку ў абсягу савецкага будаўніцтва.

Гэта значыць, што ў сувязі з задачай пераводу буржуазна-дэмократычнай рэволюцыі ў фазу пролетарскай рэволюцыі, перад кітайскай рэволюцыяй стаіць пытаньне ўжо аб тым, якія задачы ставіць цяпер перад саветамі, устае пытаньне аб тым, якія формы земляўладаньня ўжываць цяпер у Кітаі; якія прадпрыемствы павінны быць нацыяналізаваны і г. д.

Мы маем цяпер у Кітаі падзеі выключна вялікага значэньня, якія сьведчаць аб тым, што кітайская рэволюцыя не памерла, што яна ўступае ў паласу новага уздыму. Перад Комінтэрнам і кітайскай компартыяй стаіць задача далейшага разьвіцьця рэволюцыйнага змаганьня ў Кітаі, узмацненьня атрадаў кітайскай чырвонай арміі, захвату буйных прамысловых цэнтраў для ўмацаваньня гегемоніі пралетарыяту ў разьвіваючымся рэволюцыйным руху Кітаю.

Вы бачыце, што і тут пацьверджана самым жыцьцём правільнасьць ленінскай лініі нашай партыі, якую нам прыходзіліся ў свой час адстойваць у спрэчках з Троцкім і яго тагочаснымі прыхільнікамі.

Вы ўсе, таварышы, ведаеце з газэт, што мы маем цяпер рост рэволюцыйнага змаганьня ў буйнейшай ва ўсім сьвеце колёніі, у Індыі. Змаганьне супроць уладарства ангельскага імпэрыялізму ў Індыі выліваецца ў формы паўстаньняў у Шалапуры, у адным з тэкстыльных цэнтраў Бомбэйскай провінцыі у Пэшавары, раёне, сумежным з Аўганістанам. Масы, якія паўстаюць, апіраюцца ў сваім змаганьні супроць ангельскага імпэрыялізму на цэлы рад плямен., якія да цяперашнага часу непакораны ангельскім імпэрыялізмам; гэта асабліва хвалюе цяпер ангельскі ўрад.

Трэба добра ўясьніць сабе, што прадстаўляе сабой гэты рух у Індыі, ці гэта рух, што працякае пад гегемоніяй пролетарыяту, ці гэта пакуль што рух, які вырас на аснове вялікага рабочага руху ў 1929-30 годзе, але знаходаіцца яшчэ пад уплывам індускай буржуазіі.

Можна сказаць, што масавы рух бомбэйскіх тэкстыльшчыкаў, якія зьяўляюцца красой і гордасьцю пролетарыяту Індыі, што рух джутавых рабочых у Калькуце, чыгуначнікаў вялікай Індыйскай чыгункі, што гэты рух у значнай ступені разварушыў масы і дапамог росту цяперашнай магутнай рэволюцыйнай хвалі ў Індыі. Тым ня менш мы павінны прызнаць, што рух у Індыі ня ідзе яшчэ пад уплывам пролетарыяту, цяперашні рух працякае яшчэ пад гегемоніяй буржуазіі. Нельга нацыянальную буржуазію ў Індыйскай рэволюцыі раўняць з нацыянальнай буржуазіяй кітайскай рэволюцыі: роля першай цяпер іншая, чым тая, якую іграла нацыяльная буржуазія ў першую фазу кітайскай рэволюцыі. Таму проблема індыйскай рэволюцыі ставіцца цяпер зусім паіншаму. Індыя адрозьніваецца ад Кітаю тым, што Кітай гэта поўкалёнія, дзе па першай фазе кітайская буржуазія змагалася супроць чужаземнага імпэрыялізму. Кітай ня так зросься з ангельскім імпэрыялізмам, у той час, як Індыя—калёнія Англіі і індыйская буржуазія зраслася з ангельскай, з яе банкамі, прамысловасьцю. У сілу гэтага індыйская нацыянальная буржуазія цясьней зьвязана з ангельскім капіталам. Ганды які кіруе цяпер так званым пасыўным супраціўленьнем у Індыі, робіць наступную заяву у друку: „Я ня так баюся віцэ-караля Індыі, як баюся рэволюцыянэраў з іх гвалтоўнымі мэтодамі змаганьня“. Ганды заклікае цяпер масы да змаганьня і супраціўленьня мэтодамі грамадзянскага непаслушэнства.

Пры гэтых умовах мы павінны добра ўясьніць сабе тое, што індыйскі рэволюцыйшны рух знаходзіцца толькі ў першай фазе свайго разьвіцьця, што перад індускімі комуністамі стаіць цяпер асноўная задача змагацца за гегемонію пролетарыяту ў рэволюцыйным руху Індыі, змагацца за разьвіцьцё там самастойнага рэволюцыйнага рабочага руху, і мы наглядаем жо сымптоматычныя прыметы таго, што гэта лінія, ня гледзячы на адсутнасьць сур'ёзнай арганізаванай комуністычнай партыі ў Індыі, ствараецца інстынктыўна індыйскім пралетарыятам. Калі, напрыклад, некалькі часу таму назад быў арыштаваны Нэру, які зьяўляецца адным з правадыроў нацыянал-рэформісцкага крыла профсаюзаў, група індыйскіх студэнтаў зараз-жа кінулася на прадпрыемствы, прабуючы вывесьці рабочых на абарону Нэру. Але рабочыя не крануліся з месца, а вось калі судзілі Міруцкіх вязьняў у Бомбэі, адбылася дэмонстрацыя, у якой было чвэрць мільёна ўдзельнікаў і сярод іх вялікая колькасьць рабочых. Гэта сьведчыць аб тым, што індыйскі пролетарыят пачынае ўсьведамляць сабе, як клясу, але яшчэ не ў выстарчальнай ступені, каб узяць на сябе кіраўніцтва індыйскім рэволюцыйным рухам.

Наступная задача якая стаіць перад комуністамі ў Індыі, гэта разварушыць сялянскі рук, 60 проц. усёй зямлі ў Індыі знаходзішца ў руках буйных памешчыкаў-фэўдалаў. Мы маем першыя адзнакі разварушэньня сялянства (конфэрэнцыя ў Пэнджабе); ёсьць весткі, што ў радзе провінцый сялянства прыходзіць у рух, але гэта яшчэ толькі першыя парасткі. Асноўная задача індускіх комуністых заключаецца ў тым, каб разварушыць на рэволюцыйнае змаганьне іншапляменныя сялянскія масы Індыі.

Трэцяя задача, якая паўстае перад компартыямі перадавых капіталістычных краёў, у сувязі з індыйскай рэволюцыяй, гэта—разварушэньне эўропэйскай рабочай клясы без дапамогі якой індыйская рэволюцыя можа пацярпець паражэньне ў першую чаргу разварушэньне ангельскага пролетарыяту.

Такавы тыя асноўныя задачы, якія ставіць перад комуністычнымі партыямі ўзрастаючая хваля індыйскай рэволюцыі.

Узмацненьне комуністычных партый, абвастрэньне клясавага змаганьня ва ўсім сьвеце рост рэволюцыйнага ўздыму—усё гэта прадыктавала нам неабходнасьць узяць курс на заваяваньне большасьці рабочай клясы. Не гістэрычныя крыкі аб тым, што мы ўжо знаходзімся ў фазе непасрэдна-рэволюцыйнай сытуацыі, а ўпартая доўгачасная, сыстэматычная работа масавых організацый, самая ўпартая чарнавая работа ў рэформісцкіх профсаюзах, работа над стварэньнем у радзе краёў чырвоных профсаюзаў—вось што неабходна для заваяваньня большасьці рабочай клясы. Мы ажыцьцяўляем таксама гэту задачу заваяваньня большасьці рабочай клясы праз стварэньне камітэтаў змаганьня на прадпрыемствах, праз ужываньне тактыкі адзінага фронту. Ці апраўдала сябе гэта лінія? Так, апраўдала. Калі да апошняга часу, у Амэрыцы, з яе агромнай міжнароднай роляй мы мелі слабую колькасна і якасна комуністычную партыю, якая выклікала на дэмонстрацыі ва ўсёй краіне ўсяго некалькі дзесяткаў тысяч чалавек, дык цяпер, пры правільна ўзятым курсе на заваяваньне большасьці рабочай клясы, у той-жа Амэрыцы, у апошніх дэмонстрацыях прымала ўдзел у адным Нью-Ёрку 150.000 чалавек. Дзякуючы гэтаму курсу, амэрыканская комуністычная партыя, ня гледзячы на самы цяжкі крызіс, які яна перажыла ў змаганьні з Ловстонам і іншымі правымі элемэнтамі, выправіла сваю лінію, і ўсьпешна ідзе па шляху заваяваньня мас і павялічэньня сваіх кадраў.

Агромнае значэньне для далейшага ўсьпешнага разьвіцьця работы Комінтэрну мелі організаваныя компартыяй міжнародныя адначасныя выступленьні першага жніўня і 6 сакавіка. На практыцы гэтых выступленьняў мы здолелі прашчупаць нашы найбольш слабыя месцы. Агромнае значэньне гэтых кампаній заключаецца ў тым, што з іх дапамогаю Комінтэрн выкоўвае інтэрнацыянальную сьвядомасьць рабочых капіталістычных краёў. Посьпех гэтых выступленьняў ёсьць пацьвярджэньне правільнасьці лініі Комінтэрну, робота якога праходзіць пры самай цеснай дапамозе і ўдзеле дэлегацыі ЎсеКП(б) у Комінтэрне.

Працяг дакладу т. Мануільскага —у наступным нумары

Дзеньнік зьезду

На ранішнім пасяджэньні ад 4-га чэрвеня працягваліся спрэчкі па дакладу ЦК КП(б)Б. У спрэчках выступілі наступныя таварышы: **Віленская, Александраў, Кажданы, Карцова, Лукьянаў, Дзямьянчык, Хандр ні, Дзякаў, Клебанаў, Кінэр, Нікіфараў, Арашчук, Тамашэўскі, Голубава, Траянкер, Вайман, Шаін, Чарнушэвіч, Аксючыц Мінін, Ягораў, Крылоў.**

У канцы ранішняга пасяджэньня зьезд прывітала дэлегацыя ад рабочых гомельскага заводу імя Ланцуцкага.

Тав. **Вягін,** які выступіў ад імя рабочых заводу імя Ланцуцкага, сказаў:

— На сёнешні дзень мы цалкам ліквідавалі прарывы ня толькі першага кварталу і першага паўгодзьдзя, мы маем выкананьне 100 проц. на трэці квартал. Пад кіраўніцтвам партыйнай організацыі заводу, пры поўным уяўленьні рабочымі ўсяго заводу цягава-зборнага цэху мы 28 мая абгаварылі пытаньне аб тым, **каб к XIII-му зьезду КП(б)Б выпусьціць звыш нормы адзін паравоз. І сёньня гэты цягнік з вагонам прышоў сюды ў Менск.**

Ад імя рабочых і служачых будуючайся фабрыкі штучнага шоўку ў Магілеве выступіў тав. Міндлін, ад інжынэрна-тэхнічнага пэрсаналу той-жа фабрыкі выступіў тав. **Барун.**

Ад калгасу імя Дзяржынскага Каліцкавіцкага раёна, Мазырскай акругі выступіла тав. Кучынская. **Ад калгасу імя „Зьвязды“** выступіў тав. **Макеяў і ад калгасу „Камінтэрн“—тав. Сьвідкоўскі.**

З адказам на прывітаньні ад імя зьезду выступіў тав. **Галадзед.**

* * *

На вячэрнім пасяджэньні па дакладу ЦК КП(б)Б выступілі т. т. **Агульнік, Пушчын, Крацэр, Адамовіч, Гельман, Пятушкоў, Гофман, Бурава, Сапун, Бэнэк, Чапелкін, Аранштам, Каравін, Фёдараў, Арнольдаў.**

У канцы пасяджэньня зьезд прывіталі ад імя колгасьнікаў Гомельшчыны тав. **Міроненко,** і ад імя колгасьнікаў Бабруйшчыны тав. **Семчэнко.**

З адказам на прывітаньні ад імя зьезду выступіў т. **Будзінскі.**



Бурло.—5 год на вытворчасьці, (завод „Дрэваапрацоўшчык“, Менск) комсамолец, ударнік, прыняты гэтымі днямі ў партыю.

Дзеньнік зьезду

— На ранішнім пасяджэньні ад 3-га чэрвеня з організацыйнай справаздачай ЦК КП(б)Б выступіў сакратар ЦК КП(б)Б т. **Я. А. Васілевіч.** Са справаздачай рэвізійнай камісіі ЦК КП(б)Б выступіў т. **Кроль.**

— У спрэчках па дакладу т. т. Гея і Васілевіча на ранішнім пасяджэньні выступілі т. т. **Канавалаў, Зыльбэр, Чэрвякоў і Смаль.**

— У канцы ранішняга пасяджэньня зьезд віталі чырвонаармейскія часьці Менскага гарнізону. З прывітальнымі прамовамі выступалі: ад курсантаў АБВШ т. **Буйко,** ад №-кай беларускай стралковай дывізіі т **Эпштэйн** і ад №-скай кавдывізіі т. **Мэеровіч.**

Для прывітаньня чырвонаармейцаў зьезд вылучыў дэлегацыю ў складзе наступных таварышоў: Ягорава, Аранштама, Бэнэка, Сенкевіча, Адамовіча, Чахновіча, Хаталенка, Гурчонка, Кавальчука, Карнейчыка, Бурава, Арашчука, Пятушкова, Рапапорта, Разумава, Пішнёнка.

— **Учора а 5 гадзіне ўвечары ў гонар XIII Усебеларускага зьезду КП(б)Б адбылася вялізарная дэмонстрацыя рабочых гор. Менску і вайсковых часьцей.**

— Пасьля дэманстрацыі зьезд віталі прадстаўнікі рабочых Менскіх фабрык і заводаў.

Ад мэталістых гор. Менску зьезд вітае т. Бабенка. Тав. Бабенка рапартуе аб дасягненьнях заводу **„Комунар“.** —Завод „Комунар“ кажа т. Бабенка, вырас з працкалектыву і с-г. майстэрань. Вытворчая праграма ў 1927-28 годзе складала 1200 тысяч руб. з агульнай колькасьцю рабочых у 413 чалавек. Вытворчая праграма на 1929-30 год складае 3117 тыс. р. з колькасьцю рабочых у 441 чалавек. За 7 месяцаў па выпрацоўцы прадукцыі прамфінплян выкананы на 103,8 проц.

— Наш завод, — кажа далей т. Бабенка, мае зараз тры ўдарныя цэхі, два комуністычных цэхі. Рабочыя тарнага цэху аднагалосна пастанавілі абвясьціць сябе цэхам ударным імя XIII зьезду КП(б)Б.

Тав. Бабенка зачытвае заяву старых рабочых аб уступленьні ў рады КП(б)Б.

— **Ад імя трох з паловай тысяч рабочых-чыгуначнікаў зьезд вітае т. Мехэдка.**

— Чыгуначнікі менскага вузла ўступілі ў соцспаборніцтва. На 1-га чэрвеня ўдарным рухам ахоплена 3615 чыгуначнікаў.

— Але гэта толькі першыя крокі нашага соцыялістычнага спаборніцтва. Мы, рабочыя-чыгуначнікі на XIII зьезьдзе комуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі заяўляем, што наш паравоз, для якога сэмафор быў адкрыты ў Кастрычніцкую рэвалюцыю 1917 году, шпарка ідзе наперад. Соцыялістычнае спаборніцтва, якое кідае новы вугаль у топку нашага цягніка, прымушае яго яшчэ шпарчэйісьці наперад да „станцыі“ Соцыялізм.

— **Ад чыгуначнікаў Асіпавіцкага вузла зьезд вітае т. Хічэўскі.**

— **Ад рабочых-гарбароў зьезд вітае т. Станчык.**

— У першае паўгодзьдзе завод „Бальшавік“ меў прарыў у выкананьні прамфінпляну. Рабочыя чырвонаштандартнага заводу „Бальшавік“ прыклалі ўсе намаганьні, усю энэргію і, пачынаючы з сакавіка, мы прамфінплян выканалі з перавышэньнем.

— **Тав. Квіткевіч вітае зьезд ад чыгуначнікаў.**

— Мы, рабочыя-чыгуначнікі перадаем свой падарунак XIII зьезду КП(б)Б—спэцыяльна адрамантаваны цягнік, 8 таварных вагонаў і 3 клясных вагоны. Надыходзячаму XVI зьезду ЎсеКП(б) мы рыхтуем у падарунак 10 таварных вагонаў.

— **Ад імя 10000 с.-г. і лясных рабочых Беларусі зьезд вітае т. Стучынскі.**

— **Ад шкляной гуты імя Камінтэрну Бабруйскай акругі зьезд вітае т. Янтоўскі.**

— Ад імя 3000 чыгуначнікаў Аршанскага вузла з прывітаньнем выступіў т. Цярэньцьеў.

Тав. Цярэньцьеў зачытвае рапарт аб рабоце Аршанскага вузла. Ад імя чыгуначнікаў Аршанскага вузла прамоўца запэўняе XIII зьезд у тым, што чыгуначнікі прыкладуць усе сілы да зьнішчэньня недахопаў, якія маюць месца на Аршанскім вузьле.

Дэлегат зьезду



Лібо.—45? год на вытворчасьці. Працуе на заводзе з першага дня яго адчыненьня. Ударнік, прыняты этымі дн ямі ў партыю.

(з. „Дрэваапрацов.“)

— **Ад інжынэраў і тэхнікаў Аршанскага вузла зьезд вітае т. Афонін.**

— Дазвольце запэўніць XIII зьезд КП(б)Б, кажа тав. Афонін, што той прарыў, які быў на Аршаншчыне, які быў шырока асьветлены на старонках друку, у сучасны момант ліквідаваны.

— **Ад інжынэраў і тэхнікаў г. Менску зьезд вітаў т. Каплан.**

— **Ад рабочых друкарні імя Сталіна зьезд вітае наборшчык друкарні т. Гельфанд.**

Вітаючы зьезд т. Гельфанд расказаў, што друкарня за першае паўгодзьдзе выканала прамфінплян на 103 проц. Друкарня абвясьціла сябе ўдарнай. Мы прыстасоўваем нашу друкарню да таго, каб ленінскім друкаваным словам дапамагчы партыі пабудаваць соцыялізм.

— **Ад рабочых-будаўнікоў ільна-прадзільнага камбінату г. Воршы вітаў зьезд т. Ласкін.**

— **Ад Бабруйскага дрэваапрацоўчага камбінату зьезд вітаў т. Бэйла.**

Да XIII зьезду КП(б)Б 20 рабочых камбінату падалі заяву аб уступленьні ў рады комуністычнай партыі.

— **Ад колгасу „Прагрэс“, Бабруйскага раёну, зьезд вітаў т. Васіленка.**

— **Ад імя комунараў комуны „Зьвязда“, Сьмілавіцкага раёну, з прывітаньнем зьезду выступіў т. Лысок.**

— **Зьезд віталі ад нацыянальнага колгасу Мазыршчыны т. т. Міневіч і ад інтэрнацыянальнага колгасу „Соцыялістычны век“ т. Курцэн.**

— **Ад імя 25.000 працаўнікоў асьветы,** у тым ліку ад імя навуковых працаўнікоў Беларускай Акадэміі Навук, Беларускага Дзяржаўнага Ўнівэрсытэту, Беларускай С.-Г. Акадэміі і інш. навукова-дасьледчых установ Савецкай Беларусі **зьезд вітаў Акадэмік т. Вальфсон.**

З прывітаньнем ад Усебеларускай канфэрэнцыі асьветнікаў і сельскіх настаўнікаў вітаў зьезд т. Васілеўскі.

* * *

Вячэрняе пасяджэньне зьезду скончылася словам т. **Грысевіча,** які адказаў ад імя зьезду на прывітаньні.

XIII зьезд КП(б)Б

Спрэчкі па дакладу тав. Мануільскага аб рабоце ЦК КП(б)

Прамова М. М. Галадзеда

Таварышы! Наш ленінскі Цэнтральны Камітэт Усесаюзнай Комуністычнай партыі, а пад яго бальшавіцкім кіраўніцтвам і ўся партыя, падыходзіць да XVI зьезду з вялізарным станоўчым балянсам як у пытаньнях міжнароднае палітыкі, так і ў пытаньнях соцыялістычнага будаўніцтва ў краіне саветаў—краіне пролетарскай дыктатуры, а таксама і ў барацьбе за ленінскае адзінства, за ленінскае выхаваньне нашай партыі, за яе генэральную лінію, за ленінскую лінію ўсяго Комуністычнага Інтэрнацыяналу ў барацьбе з усякімі адхіленьнямі ад гэтай ленінскай лініі. У міжнародных пытаньнях палітыка міру, якую пасьлядоўна праводзіць наш ЦК УсеКП(б), дала магчымасьць нашай партыі і ўсёй рабочай клясе нашай краіны выкарыстаць перадышку для ўзмацненьня позыцый соцыялізму. Пад выпрабаваным кіраўніцтвам ЦК УсеКП(б), урад Савецкага Саюзу ўмела прайшоў за гэты пэрыод праз усе правакацыі імпэрыялістычных дзяржаў, якія правакавалі нас на вайну. Палітыку міру, якую ўмела праводзіць наш ЦК, не даючы асобным зарваўшымся - капіталістычным дзяржавам наступіць нам, як кажуць, „на мазоль", мобілізуючы сотні мільёнаў рабочае клясы ўсяго сьвету і ўсіх прыгнечаных народаў, галоўным чынам каленіяльных краін і краін усходу, мобілізуючы на абарону Савецкага Саюзу ад імпэрыялістычнага нападу.

Тыя вялізарныя дасягненьні, якія мае наша партыя і ўвесь Комуністычны Інтэрнацыянал ва ўздыме і пашырэньні рэвалюцыйнага руху рабочай клясы ва ўсім сьвеце і ў яе консолідацыі, пацьвярджаюць правільнасьць прагнозу і аналізу нашай партыі, які даны нашай партыяй у выглядзе констатаваньня пасьлядоўнага, няўхільнага расхістаньня, так званай, адносная капіталістычнай стабілізацыі. Гэта пацьвярджае наяўнасьць і рост імпэрыялістычных супярэчнасьцяй і рост соцыяльна-клясавых супярэчнасьцяй. Гэта перакульвае цалкам і без астатку тэорыі правых опортуністых аб так званым „організацыйным капіталізьме".

Ва ўнутраной політыцы наша партыя і рабочая кляса маюць вялізарныя дасягненьні ў справе індустрыялізацыі краіны. Лічбы, якія агалашаў тав. Мануільскі аб росьце прамысловасьці Саюзу, аб машынабудаўніцтве і аб с.-г. машынабудаўніцтве,—выразна паказваюць, што нашаму ЦК УсеКП(б) удалося па сапраўднаму павесьці нашу краіну па шляху ленінскай індустрыялізацыі і праз гэты індустрыяльны вагар пацягнуць па шляху сапраўднага соцыялістычнага пэратварэньня самы адсталы вучастак народнай гаспадаркі—раздробленую дробна-сялянскую сельскую гаспадарку.

Калі ўзяць асноўны завет Уладзімера Ільліча Леніна аб электрыфікацыі, дык і тут мы бачым, што гэты завет Леніна наша партыя праводзіць у жыцьцё на ўсіх парах. Электрыфікацыя, як вам вядома, зьяўляецца адным з асноўных мерапрыемстваў у справе ўздыму нашай дзяржавы пролетарскай дыктатуры на належны тэхнічны, эканамічны і індустрыяльны ўзровень.

Ня будзе перавялічэньнем, таварышы, калі мы скажам, што наш Савецкі Саюз сёньня ўвайшоў ужо ў такую стадыю соцыялістычна-індустрыяльнага разьвіцьця, калі тыя прадпрыемствы, якія 5 год таму назад здаваліся недасягаемымі па сваёй вялічыні, сёньня ўжо выглядаюць мініятурнымі перад тымі вялізарнымі гігантамі і комбінатамі, якія вырастаюць сёньня на пролетарскай глебе ў нашым Савецкім Саюзе. Такія будаўніцтвы, як Днепрабуд, Магнітабуд, трактарныя заводы, заводы комбайнаў, вялізарныя чыгуначныя шляхі і г. д.—гэта ўжо ёсьць тыя об'екты сапраўднага індустрыяльнага разьвіцьця, якому можа пазайздросьціць любая капіталістычная, перадавая ў тэхнічных адносінах, дзяржава. Калі мы прыступаем зараз да проэктаваньня генэральнага пляну разьвіцьця народнай гаспадаркі, дык зусім невыпадкова перад намі паўстае задача, што мы павінны орыентавацца на вялікія індустрыяльныя об'екты ў нашым Савецкім Саюзе. Прыкладам нашага няўхільнага росту можа зьявіцца тое, што тыя раённыя электрастанцыі, якія па першым пляне ГО ЭЛРО выдаваліся, як наймагутнейшыя гіганты, сёньня яны ўжо на фоне росту нашага электрабудаўніцтва не зьяўляюцца станцыямі характэрнымі для нашага маштабу і становішча часамі станцыямі, якія маюць мясцовае значэньне. Так, электрастанцыі ў тыс. кілёв. сёньня ўжо, дзякуючы вялізарнаму тэмпу разьвіцьця нашай індустрыялізацыі, ужо ня могуць задавальняць патрэб раённага значэньня. Сёньня мінімальная ёмістасьць раённых электрастанцый перад намі вырысоўваецца (і на справе будуюцца) сілаю ня менш, як 100 тыс. квт.

У Беларусі мы таксама пераходзім ужо на шлях будаўніцтва буйных комбінатаў, мы ў кантрольных пунктах на 1930 31 г. запроэктавалі будаўніцтва буйнога комбінату на црапойскіх тарфяных масывах. Прапойскі комбінат павінен уключаць па нашых меркаваньнях электрастанцыю ў 100 тыс. квт. буйны завод па выпрацоўцы мінэральных угнаеньняў і другія прадпрыемствы, якія будуць базавацца на торфе, як на сырцовай базе.

З тых лічбаў і фактаў, якія агалошаны т. Мануільскім, таксама відаць, што на фоне гэтага магутнага індустрыяльнага росту ў нас ёсьць і слабыя месцы. Аб іх мы павінны гаварыць, і было-б зусім няправільна, калі-б іх прыкрывалі, калі-б мы не гаварылі, дзе трэба падцягнуць нашу работу і дзе мы сустракаемся з труднасьцямі. З гэтых слабых месц я хачу спыніцца толькі на некаторых, паколькі т. Мануільскі ўжо падрабязна гэтае пытаньне высьвятляў. Я хачу закрануць такія галіны - мэталь, экспорт і машынабудаўніцтва, — якія яшчэ зьяўляюцца слабымі месцамі, якія партыя павінна падцягнуць з самай напружанай энэргіяй.

Пытаньням мэталю, машынабудаўніцтва і экспорту Цэнтральны Камітэт УсеКП(б) надае цэнтральнае месца, але гэтыя пытаньні павінны і ў далейшым яшчэ больш сконцэнтраваць увагу ўсёй нашай партыі. Пры нашых надзвычай вялікіх тэмпах, якімі мы ідзем па шляху соцыялістычнага будаўніцтва, мэталь і выраб машын будуць па сутнасьці рашаючымі фактарамі далейшых тэмпаў соцыялістычнага разьвіцьця нашае краіны.

Тав. Сталін ня раз гаварыў аб тым, што наша першачарговая задача заключаецца ў тым, каб пасьлядоўна і як мага хутчэй, пры разьвіцьці сваёй уласнай („отечественной") буйнай машыннай індустрыі вызваляцца ад эканамічнай залежнасьці капіталістычных дзяржаў.

Таварышы! Вырашэньне гэтай важнейшай задачы ў першую чаргу і галоўным чынам павінна ісьці і залежыць ад форсаванага разьвіцьця прамысловасьці, якая вырабляе сродкі вытворчасьці, г. зн. буйной машыннай індустрыі, і вырашэньня проблемы мэталюргічнай прамысловасьці. Разьвіцьцё ўласнай машыннай індустрыі зьяўляецца ключом да вырашэньня гэтай задачы эканамічнага вызваленьня ад залежнасьці ад капіталістычных дзяржаў, пакуль у іх не адбылася пролетарская рэволюцыя.

Таму мы можам сёньня, на XIII зьезьдзе КП(б)Б, адзначыць, што Цэнтральны Камітэт Усесаюзнай Комуністычнай партыі вядзе зусім правільную лінію, калі ён асноўную масу сродкаў накіроўвае на разьвіцьцё буйной прамысловасьці, вядучай індустрыі і калі ён значную частку прыбыткаў лёгкай прамысловасьці перакідвае ў разьвіцьцё буйной прамысловасьці. Гэта політыка правільная, яе трэба працягваць і надалей. Вядучыя галіны нашай індустрыялізацыі павінны ў першую чаргу мець ад дзяржавы матар'яльнае, фінансавае і энэргетычнае падтрыманьне. Ня будзе перавялічаным, калі скажу, што мэталь і ўласнае („отечественное") машынабудаўніцтва ў далейшым будуць асноўным лімітам тэмпаў нашага соцыялістычнага будаўніцтва.

Экспортная справа зьяўляецца таксама ў цэнтры работы нашай партыі.

Тав. Мануільскі ўжо сказаў адносна становішча экспортна -імпортнага пляну, і я наконт гэтага паўтарацца ня буду. Я толькі адзначу, што і перад КП(б)Б таксама ў галіне э к с п о р т у стаіць адказьнейшая задача. — БССР такая рэспубліка, якая можа даць добры прыклад разьвіцьця экспорту другарадных галін. Сёньня, пасьля выпадзеньня ў апошнія гады з экспортнага пляну хлеба, другарадныя галіны экспорту ўжо перастаюць быць другараднымі. Яны ўсё больш і больш адыгрываюць сур'ёзную ролю ва ўзмацненьні нашага валютнага пляну. Таму задача ўсёй нашай партыі, усёй КП(б)Б і савецкай грамадзкасьці Беларусі ў галіне разьвіцьця экспорту заключаецца ў тым, каб мы заданьне ЦК УсеКП(б), заданьне ўраду Саюзу выканалі на ўсе 100 проц. Пытаньні валюты і экспорту, а гэтым самым пытаньні імпортнага абсталяваньня зьяўляюцца такімі пытаньнямі, якія стаяць у галаве вугла эканамічнай політыкі нашай партыі.

У нас, таварышы, ёсьць цэлы рад проблем у галіне прамысловага будаўніцтва БССР. Я хачу зараз паставіць гэтыя проблемы, якія стаяць перад КП(б)Б, у сувязі з дакладам т. Мануільскага аб рабоце ЦК УсеКП(б) і з тэй мэтай, каб высунуць гэтыя пытаньні, каб мець яшчэ большае падтрыманьне з боку ЦК УсеКП(б) у справе індустрыялізацыі Савецкай Беларусі, як часткі Савецкага Саюзу.

Асноўнай проблемай у нас у БССР зьяўляецца торф. Торф на Беларусі пачынае зьяўляцца ўжо асноўнай энэргетычнай і часткова сырцовай базай нашай індустрыялізацыі. Нам патрэбна дапамога з боку ЦК УсеКП(б) дзеля таго, каб выкарыстаць гэту асноўную базу ня толькі як базу энергетыкі, але і як сырцовую базу, каб дапамагчы нам паставіць на прамысловыя рэйкі вывучэньне і разгортваньне проблем торфу ў галіне хэмічнай яго пераапрацоўкі: газафікацыя, коксаваньне, выпрацоўка такіх сырцовых элемэнтаў, на якіх маглі-б вырастаць буйныя індустрыяльныя прадпрыемствы. На Беларусі пакуль-што мы не знайшлі (трэба думаць, што няма) руды, мэталю і вугалю, таму ў нас торф зьяўляецца ключом індустрыялізацыі БССР. Прыкладам зьяўляецца Асінбуд і другая раённая электрастанцыя, якая будуецца ў Гомелі, якія па сутнасьці створаць тэхнічны пераварот у нашай прамысловасьці. Але гэта толькі першыя крокі ў выкарыстоўваньні торфу, як энэргетычнай базы. Мы павінны паставіць на ўсіх парах проблему выкарыстоўваньня торфу, як базы сырцовай. Для вырашэньня гэтай проблемы нам патрэбна яшчэ большая дапамога з боку ЦК УсеКП(б).

Мы ставім перад сабой задачу разгортваць буйныя комбінаты па торфе і ад Цэнтральнага Камітэту УсеКП(б) мы просім падтрыманьня ў гэтай справе.

Мы можам даць таксама прыклады скарыстаньня электраэнэргіі ў сельскай гаспадарцы. Гэтую справу мы павінны таксама разгортваць пры дапамозе ЦК УсеКП(б).

Мы ставім перад сабой задачу, якая таксама стаіць перад усім Савецкім Саюзам—гэта вырашэньне проблемы разьвіцьця ўласнай („отечественной") машынабудоўлі. Зусім правільнай зьяўляецца політыка ЦК УсеКП(б), у якой адным з галоўных пунктаў ставіцца задача пашырэньня машынабудаўніцтва ўнутры Саюзу ССР з тым, каб гэтым самым хутчэй вызваліцца ад эканамічнай залежнасьці капіталістычных дзяржаў. І ў гэтай справе Беларусь таксама можа адыграць пэўную ролю ў тых адносінах, што, калі, асноўныя індустрыяльныя цэнтры нашага Савецкага Саюзу будуць абслугоўваць важнейшыя об'екты саюзнай індустрыі, дык мы ўжо наладзілі ў сябе і можам далей пашырыць такую галіну мэталяапрацоўчай прамысловасьці, як сярэдняе машына-будаўніцтва, выраб с-г. машын, выраб шляхавага інвэнтара, выраб стандартных прылад для індустрыялізацыі процэсаў самога будаўніцтва, якое ў нас часта праводзіцца яшчэ прадзедаўскімі мэтодамі. Мы ўжо маем значныя посьпехі ў разьвіцьці гэтых галін прамысловасьці. Нашы паўсаматужныя ў былым прадпрыемствы, як напрыклад, „Энэргія", „Комунар", „Пролетары" і „Сельмаш" у Гомелі, завод імя Ланцуцкага, завод „Чырвоны Мэталісты" у Віцебску—ужо даўно перабудаваны і зьяўляюцца зараз досыць буйнымі ў нашых умовах прадпрыемствамі, якія адыгрываюць вялізарную ролю ў справе вырабу сродкаў вытворчасьці і абсталяваньня для задач індустрыялізацыі БССР.

Па лініі разьвіцьця сярэдняй мэталяапрацоўчай прамысловасьці мы, пры дапамозе ЦК УсеКП(б), павінны таксама адыгрываць тую ролю, якая адведзена Беларусі ў вырашэньні гэтай важнейшай для УсеКП(б) проблемы разьвіцьця ўнутранога машынабудаўніцтва і ў нашым Савецкім Саюзе.

Вось што, памойму, зьяўляецца асноўным (аб тэкстыльнай прамысловасьці я буду гаварыць далей) для разьвіцьця індустрыялізацыі БССР, як часткі Савецкага Саюзу на фоне тэй справаздачы ЦК УсеКП(б), якую мы заслухалі.

Дазвольце мне коратка зараз спыніцца на пытаньнях колектывізацыі. Каб не паўтарацца з раней выступаўшымі таварышамі, я коратка павінен адзначыць, што ў гэтай галіне наша партыя мае нязьмерна вялікія дасягненьні. У галіне разьвіцьця сельскай гаспадаркі збожжавая проблема, якая стаяла перад нашай партыяй як цэнтральная проблема, з а р а з у а с н о ў н ы м ужо вырашана праз організацыю буйнога аграмаджанага соцыялістычнага земляробства, вышараецца на базе колектывізацыі. Перад нашай партыяй стаяць зараз задачы вырашэньня мясной, жывёлагадоўчай проблемы і проблемы разьвіцьця тэхнічных культур. 40-50 проц. колектывізацыі ў збожжавых раёнах, сяўбы пановаму робяць расстаноўку клясавых сіл у вёсцы, як аб гэтым гаварыў т. Мануільскі. І калі мы ўчытаемся ў тэзісы, зацьверджаныя політбюро аб выніках колектывізацыі і разьвіцьці сельскае гаспадаркі, мы ўбачым, што наша партыя за пэрыод ад 15 да 16 зьезду ў галіне соцыялістычнай рэконструкцыі сельскае гаспадаркі па сутнасьці адкрывае новую старонку ленінскай тэорыі, новую старонку марксызму-ленінізму ў пытаньнях апоры савецкай улады ў вёсцы. У тэзісах гаворыцца, што зараз ужо ў асноўных збожжавых раёнах пановаму ставіцца задача апоры савецкай улады на вёсцы; у тэзісах гаворыцца, што апорай на вёсцы зьяўляюцца колгасьнікі, новыя аб'яднаныя сілы, якія консалідуюцца на новых соцыялістычных вытворчых адносінах, на базе колгасаў, на базе аграмаджанай працы, аграмаджаньня сродкаў вытворчасьці. Гэта новая старонка марксызму-ленінізму, гэта тое новае, чаго ня бачыў увесь сьвет. Практыка работы нашай партыі за апошні пэрыод абагачае тэорыю марксызму-ленінізму новымі паглыбленым матар'ялам новымі фактамі. Міма гэта ня можа прайсьці комуністычны рух усяго сьвету. На гэтым вопыце будуць вучыцца ўсе сэкцыі Комуністычнага Інтэрнацыяналу.

Таварышы! Гэтыя посьпехі былі-б яшчэ большымі ў справе колектывізацыі, калі-б мы нарабілі менш памылак. Я ня буду паўтараць таго, што ўжо гаварылі да мяне аб памылках і яшчэ будзем гаварыць па дакладу ЦК КП(б)Б, а скажу толькі, што мы павінны ад імя ўсёй КП(б) Б заявіць Цэнтральнаму Камітэту УсеКП(б), што ЦК УсеКП(б) ад пачатку да канца правільна і пабальшавіцку кіраваў гэтай важнейшай, рашаючай, маючай гістарычнае значэньне справай колектывізацыі.

Мы, таварышы, ведаем пра спробы правых опартуністых узваліць памылкі, зробленыя на мясцох, у тым ліку абласнымі і нацыянальнымі партыйнымі організацыямі, зваліць на плечы нашага ЦК УсеКП(б) і іншых—самім падарваць давер'е да кіраўніцтва нашай партыі. Я не памылюся, калі скажу, што гэтыя спробы апорнуністых і іх памочнікаў „левых" загібшчыкаў, як з боку ўсёй партыі, так і з боку КП(б)Б, сустрэнуць самы энэргічны і бязьлітасны адпор, і ўся КП(б)Б, разам з усёй партыяй, зможа пастаяць за свой Цэнтральны Камітэт усесаюзнай комуністычнай партыі і ня дасьць нікому зваліць свае апортуністычныя вывіхі на наша кіраўніцтва, каб гэтым самым яго дыскрэдытаваць. Мы заяўляем, што лінія ЦК УсеКП(б) у справе колектывізацыі, у справе генэральнага пэратварэньня сельскае гаспадаркі на соцыялістычны лад зьяўляецца ад пачатку да канца правільнай.

Зусім правільна адзначыў т. Мануільскі і тыя памылкі, якія зроблены ЦК КП(б)Б. Мы, таварышы, павінны сказаць, што ЦК КП(б)Б пры правільнай у асноўным лініі ў справе колектывізацыі, зрабіў паасобныя політычныя памылкі. У нас таксама крыху закружылася галава ад посьпехаў. Мы свае памылкі самі своечасова прызналі і выправілі. І зусім не дзеля таго, каб паслабіць позыцыі ... нашых памылак з боку ЦК УсеКП(б) ... з боку членаў КП(б)Б. Не, ЦК УсеКП(б) як і ўся партыйная маса павінны крытыкаваць нашы памылкі, якія мы прызналі, крытыкаваць і выкрываць далей тыя, якіх мы самі яшчэ не заўважылі.

Наш Цэнтральны Камітэт КП(б)Б выправіў гэтыя памылкі з бальшавіцкай сьмеласьцю і рашуча прызнаўся ў іх, выходзячы з неабходнасьці больш рашучага забесьпячэньня правядзеньня генэральнай лініі нашай партыі ў гэтым важнейшым пытаньні. Вось гэта было асноўнай кіраючай падставай, якая кіравала намі пры выкрыцьці нашых уласных памылак, што мы мелі. Адначасова мы павінны заявіць, што ЦК КП(б)Б своечасова стаў на барацьбу з загібамі і памылкамі, якія дапушчаны на мясцох, выкрываючы ў той-жа час і свае ўласныя памылкі.

Я хацеў-бы толькі ў сувязі з гэтым сказаць, што і мясцовым організацыям, нарабіўшым памылак у справе колектывізацыі, ня трэба хавацца за паасобныя памылкі ЦК КП(б)Б. Трэба, выкрываючы гэтыя памылкі, прызнаваць іх, не хавацца за сьпіной ЦК КП(б)Б, таксама, як і УсеКП(б) не павінна хавацца за сьпіною ЦК УсеКП(б). Толькі пры такіх умовах мы зможам гарантаваць правільнае правядзеньне лініі нашай пары, лініі бальшавіцкага ЦК УсеКП(б).

Важнейшымі проблемамі, якія ставіць перад сабой КП(б)Б у разьвіцьці сельскае гаспадаркі, зьяўляюцца наступныя проблемы, на якія просім ЦК УсеКП(б) зьвярнуць увагу і дапамагчы нам іх вырашыць. Першае—гэта жывёла. Мы можам па разьвіцьці жывёлагадоўлі зьявіцца адным з асноўных раёнаў Саюзу, асабліва па разьвіцьці сьвіней Другое — гэта проблема разьвіцьця лубяных культур (ільну, канапель), і ў сувязі з гэтым разьвіцьцё тэкстыльнае прамысловасьці. Узмацніўшы мэліярацыю, мы зможам зьвіцца асноўным раёнам СССР па разьвіцьці тэхнічных культур. Па гэтых пытаньнях нам трэба яшчэ большае падтрыманьне ЦК УсеКП(б).

Апошняя пытаньне, на якім я хачу спыніцца, гэта пытаньне адносна нацыянальнай політыкі, якую праводзіў ЦК УсеКП(б). Я на гэтым пытаньні прымушаны спыніцца таму, што, мне здаецца, з боку некаторых таварышоў тут у іх выступленьнях былі дапушчаны па меншай меры „нетактычныя" (выбачайце за такі скромны выраз) выпады. Вопыт 12-цігадовай работы нашай партыі паказаў самым выразным чынам, што ЦК усеКП(б) у нацыянальным пытаньні (як і ў другіх пытаньнях) стаіць на ленінскіх позыцыях. Тыя дасягненьні, якія мае Савецкая Беларусь, як нацыянальная рэспубліка, пад кіраўніцтвам КП(б)Б і УсеКП(б), на сёньнешні дзень выразна паказваюць вялізарнейшую ўвагу, якую звярачаў ЦК УсеКП(б) на гаспадарчы і культурны ўздым нацыянальных рэспублік і абласьцей. Вось вам некаторыя конкрэтныя лічбы. У мэліярацыі па БССР за апошнія 3 гады ўкладаліса наступныя сумы: у 1927-28 годзе каля 1 млн. руб., 1828-29 годзе—2 млн. руб., а ў 1929-30 годзе — 7 млн. руб. На 1930-31 год мы проэктуем 30 млн. руб. Хто бачыў такія тэмпы? Калі таварышы прад'яўляюць прэтэнзіі да ЦК УсеКП(б), дых яны забываюць, што мы ня ўмеем самі нават цаніць таго, што мы робім, чаго мы дабіліся пад кіраўніцтвам ЦК УсеКП(б).

Таварышы! Нядаўна ва украінскіх газэтах адзін профэсар апісаў нашу мэліярацыю. Ён піша, што такога размаху работ па асушальнай мэліярацыі, якая праводзіцца ў БССР (а фінансаваньне яе праходзіць па саюзным бюджэце), ня бачыў яшчэ сьвет. Мы атрымалі заключэньне ад Дзяржпляну Саюзу адносна мэліярацыі, і ў гэтым заключэньні гаворыцца, што, паколькі такіх маштабаў асушальнай мэліярацыі, якая праводзіцца зараз на Беларусі, яшчэ ня бачыў сьвет, трэба яе праводзіць, як вопыт гіганцкага значэньня. І сапраўды, таварышы, калі экспэдыцыя Жылінскага ў дарэволюцыйныя часы правяла на тэрыторыі сучаснай БССР, на Палесьсі, канал у 60 кілём., дык навуковая літаратура ўсяго сьвету ў адзін голас бубніла аб гэтым. А мы за апошнія гады нашага будаўніцтва правялі асноўных магістральных каналаў, па якіх ня толькі асушаем балоты, але і сплаўляем лес 425 клм. А калі мы яшчэ ажыцьцёвім плян бягучага году, дык гэта лічба амаль што падвоіцца. Як-жа можна недаацэньваць такіх фактаў?

Другі прыклад. Валавая прадукцыя па цэнзавай прамысловасьці БССР у цэнах 1926-27 г. складала: у 1925-26 г. —108,4 млн., у 1926-27 г.—126,9 млн., у 1927-28 г.—176,3 млн., у 1928—29г.—257,3 млн., у 1929-30 г.—425 млн. р. а ў 1930-31 г. мы мяркуем мець валавой прадукцыі па цэнзавай прамысловасьці на суму 850 млн руб. Процант росту валавой прадукцыі па гэтых гадох выглядае наступным чынам: 26-27 г.—113,4 да папярэдняга, 27-28 г. 158,8 проц., 28-29 г.—145.8 проц., 1929-30 г.—165,1 проц. Удзельная вага прамысловай прадукцыі (па цэнзавай) у адносінах да прампрадукцыі ўсяго СССР выглядае па гэтых-жа гадох так: 1,1 проц., 1,3 проц., 1,43 проц., 2,13 проц.—значыцца, мы расцем хутчэй сярэдняга тэмпу па Саюзе.

Такі-ж малюнак і з ростам асноўных фондаў, удзельная вага якіх у нас павышаецца з кожным годам.

Таварышы, калі тут раздаваліся рэплікі т. Мануільскаму, што мы даем такія тэмпы таму, што нібыта Беларусь расьце ад нуля, дык гэта зусім няправільны мотыў. Сёньня мы павінны ўжо адкінуць гэты мотыў у архіў, у гісторыю, бо мы ўжо не ад нуля расьцем такімі тэмпамі, а мы расьцем такімі тэмпамі ад соцень мільёнаў прадукцыі па цэнзавай прамысловасьці. 425 млн. руб. валавой продукцыі—гэта ўжо ня нуль. Мы расьцем гіганцкімі тэмпамі, маем вялізарнейшыя дасягненьні.

Такім чынам, таварышы, вы бачыце, што мы пераганяем сярэднія тэмпы па Савецкім Саюзе, г. зн., што мы пераганяем нават тыя вялізарныя тэмпы нашага Саюзу, якіх яшчэ ня бачыла ніколі ні адна капіталістычная краіна.

(Канец прамовы Галадзеда М. М. глядзі на 6 стар.)

XIII зьезд КП(б)Б

СПРЭЧКІ ПА ДАКЛАДУ тав. МАНУІЛЬСКАГА АБ РАБОЦЕ ЦК КП(б)Б

Прамова М. М. Галадзеда

(Працяг. Пачатак гл. на 5-й старонцы)

Ці-ж можна недаацэнаваць гэтых лічбаў?

Такім чынам вы бачыце, таварышы, што з боку Цэнтральнага Камітэту УсеКП(б) і ўсіх саюзных органаў аддаецца сур'ёзная ўвага нацыянальным рэспублікам. Ці можна, напрыклад, недааацэньваць такога моманту, што ў нас у БСС уведзена ўсеагульнае абавязковае навучэньне, пакуль што гэта ўведзена ў аднэй БССР з усіх савецкіх рэспублік. Гэта мы здолелі зрабіць толькі дзякуючы дапамозе ЦК УсеКП(б), дзякуючы дапамозе ўсяго Савецкага Саюзу.

Наш мясцовы і дзяржаўны бюджэт у 1929-30 г. складае ўжо 1/4 мільярда руб., а ў 1924-25 г., калі не памыляюся, ён складаў усяго 12 мільёнаў.

У нас вырастаюць Асінбуды, буйныя заводы і фабрыкі, фабрыка штучнага валакна (адна з шасьці па Савецкім Саюзе), растуць кадры пролетарыяту. Усё гэта мы маем зноў такі дзякуючы вялізарнай увазе з боку ЦК УсеКП(б) і Саюзнага Ўраду.

І калі нашы беларускія нацыянал-дэмократы імкнуцца давесьці, што мала даюць дапамогі, ці прабуюць здабыць тыя „ільготы" для нацыяналістычнай інтэлігенцыі, якія давала калісь наша партыя ўсходнім савецкім рэспублікам і гэтымі „запатрабаваньнямі" імкнуцца адваяваць сабе „ўступачкі" і апраўдаць сваю опортуністычную мазьню, дык мы ім кажам: „не раўняйцеся па тых усходніх рэспубліках, дзе яшчэ існуюць сярэднявяковыя вытворчыя адносіны і дзе яшчэ носяць „чадру".

У нас ужо ёсьць кадры рабочай клясы, у нас уведзена ўсеагульнае навучаньне, мы ўжо апіраемся на пролетарыят. Так што ня можна раўняць БССР да ўсходніх акраінных рэспублік (Якутыя і інш.).

Вось чаму ня маюць рацыі тыя таварышы, якія ў сваіх выступленьнях далі такі малюнак, што нібыта Беларусь у саюзных органах ня мела ніякага падтрыманьня.

Было-б зусім памылкова паасобнымі шурпатасьцямі, якія часамі сустракаюцца ў Савецкім апараце пры правядзеньні нашых гаспадарчых плянаў зацямніць тую вялізарную ўвагу, якую надае нацыянальным абласьцям і рэспублікам Цэнтральны Камітэт і ўсе саюзныя кіруючыя савецкія органы.

На гэтым канчаю. Адзначаю, што ўсе гэтыя дасягненьні, якія мае ўся наша партыя, дасягнуты толькі таму, што ЦК УсеКП(б) непарушна стаіць на ленінскіх позыцыях ва ўсіх пытаньнях міжнароднай і ўнутранай пролетарскай політыкі. ЦК правільна ацэньвае пэрспэктывы міжнароднай пролетарскай рэволюцыі. ЦК правільна і рашуча змагаўся, як ленінскі штаб, за чыстату нашай комуністычнай партыі, за адзінства нашай партыі, за чыстату лініі Комуністычнага Інтэрнацыяналу; ЦК дашчэнту разьбіў контр-рэволюцыйны трацкізм, рашуча змагаўся з правым опортунізмам і нанёс яму руйнуючы ўдар. І таму наша партыя зараз, як ніколі, монолітнай ідзе на XVI зьезд.

Мы запэўнім наш ЦК УсеКП(б) ад імя XIII зьезду КП(б)Б, што і ўся КП(б)Б, якая працуе на адказьнейшым вучастку Савецкага Саюзу—на мяжы з капіталістычным Заходам, будзе і надалей адным з лепшых баявых атрадаў усесаюзнай комуністычнай партыі і ЦК УсеКП(б) заўсёды будзе апірацца на нашу організацыю ў правядзеньні сваёй ленінскай політыкі.

Мы гатовы заўсёды даць рашучы адпор усякім опортуністым. (Воплескі).

Прамова тав. Танхілевіча

Даючы ацэнку рабоце ЦК УсеКП(б), трэба перш за ўсё падкрэсьліць наступнае: ЦК УсеКП(б) забясьпечыў максымальна магчымыя тэмпы соцыялістычнага будаўніцтва, ЦК увесь час вёў упартую барацьбу з тымі элемэнтамі, якія недаацэньвалі магчымасьці нашага соцыялістычнага будаўніцтва. У той-жа час яму прыходзілася весьці барацьбу і з тымі, якія давалі фантастычныя пляны, пляны, якія немагчыма выканаць, якія сапраўды зрывалі соцыялістычнае будаўніцтва.

ЦК увесь час падмячаў усе тыя зьмены ў клясавых суадносінах, у эканоміцы, як у СССР, так і міжнароднай эканоміцы і сваечасова рэагаваў на ўсе гэтыя зьмены, сваечасова выкарыстоўваў усе магчымасьці для нашага пасьпяховага будаўніцтва.

Хацелася-б адзначыць, што ЦК пасьля XV зьезду правёў значную працу ў галіне перабудовы работы ўсіх нашых організацый. Калі ўзяць асноўныя лёзунгі партыі: лёзунгі самакрытыкі, чысткі партыі, чысткі савецкага апарату, перабудовы працы профсаюзаў, лёзунг—„сельсаветы,—тварам да колгасу!" і г. д.—усе яны сьведчаць аб тым, што ЦК сваечасова перабудоўваў працу ўсіх організацый у адпаведнасьці з генеральнай лініяй. У гэтым сэнсе ЦК правёў вялікую працу. Я павінен адзначыць такі момант,—калі перад партыяй паўстала востра пытаньне адносна тэмпаў соцыялістычнага будаўніцтва ў сельскай гаспадарцы, ён сваечасова стварыў саюзны Наркамзем і гэты крок меў вялізарнейшае значэньне для нашага соцыялістычнага будаўніцтва на вёсцы.

Гэта трэба адзначыць таму, што сярод некаторых таварышоў разносіліся чуткі, што, ствараючы саюзны Наркамзем, мы гэтым самым абмяжоўваем незалежнасьць паасобных савецкіх рэспублік. ЦК сваечасова рэагаваў на тыя ці іншыя прарывы і скажэньні лініі партыі, сваечасова мобілізаваў масы на барацьбу з троцкізмам. ЦК партыі сваечасова мобілізаваў партыю на барацьбу з правым ухілам.

У той час, калі мы маем магчымасьць констатаваць вялікі пералом у галіне прамысловасьці і разьвіцьця сельскае гаспадаркі, калі мы маем магчымасьць сказаць, што ёсьць пералом у справе падрыхтоўкі кадраў, то трэба адзначыць, што на чыгунцы тэмпы рэконструкцыі надта марудныя, на што трэба будзе зьвярнуць асаблівую ўвагу. Трэба яшчэ таксама завастрыць увагу па пытаньнях барацьбы са стратамі, бо ў гэтай галіне вядзецца яшчэ недастаткова рашучая барацьба.

Аўторытэт ЦК як сярод рабочае клясы ўсёй краіны, так і міжнароднага рэволюцыйнага руху за гэты час, з XV зьезду, значна вырас, **ЦК змог стварыць аўторытэт, і ў зьвязку з правільным кіраўніцтвам ЦК дабіўся гэтага аўторытэту на чале з тав. Сталіным.**

Прамова тав. Славінскага

Сучаснае міжнароднае становішча высоўвае перад УсеКП(б), перад нашай парторганізацыяй і XIII зьездам КП(б)Б асабліва важныя задачы.

Мы знаходзімся на мяжы, мы перажываем момант, калі эканамічны і політычны крызіс, як у дзяржавах буйных, дзяржавах моцна разьвітага капіталізму, таксама і лімітрофах, нарастае шпаркім тэмпам, абвастраючы да крайнасьці клясавыя супярэчнасьці, надзвычайна ўскладняючы міжнародныя абставіны і ўтвараючы ўсё больш рэальную пагрозу вайны. Работа нашага XIII зьезду і работа XVI зьезду Усесаюзнай Комуністычнай партыі будуць адбывацца ў момант шпарка нарастаючага рэволюцыйнага контр-наступленьня працы на капітал, адным з важнейшых стымулаў якога зьяўляецца нячуваны размах і тэмпы будаўніцтва краіны соцыялізму. Адгэтуль, зразумела, супраціўленьне, шалёнае цкаваньее і рад рашучых мер, якія прымаюцца капіталізмам для зрыву будаўніцтва соцыялізму у нашай краіне. Паход на наш экспорт, затрудненьні крэдытаваньня і рад іншых мер зьяўляюцца лепшым довадам гэтага, нашы экспортныя труднасьці і труднасьці крэдытаваньня ня могуць ня ўплываць у напрамку ўзмацненьня ўскладненьняў і труднасьцяй, якія стаяць перад партыяй і рабочай клясай Савецкага Саюзу.

Наш зьезд павінен прайсьці пад знакам таго, што, ня гледзячы на труднасьці, якія мы перажываем, што ня гледзячы ні на якія труднасьці, мы павінны напружваць усе сілы, каб у далейшым узмацняць соцыялістычную перабудову нашай сельскай гаспадаркі і ліквідацыі кулацтва, як клясы, на падставе суцэльнай колектывізацыі.

У сувязі з гэтым асаблівую важнасьць і асаблівую вострасьць набывае пытаньне зьнішчэньня тых памылак, якія зьяўляюцца скажэньнямі правільнай партыйнай лініі ў такім складанейшым пытаньні як колектывізацыя сельскае гаспадаркі. Асабліва ў галіне ўзмацненьня работы з беднатой, мы яшчэ па-сапраўднаму работы не разгарнулі.

Павінна быць нясупынная абайнасьць, нясупыннае партыйнае кіраўніцтва і няўхільная работа для таго, каб мы маглі замацоўваць тое, што маем, маглі ісьці наперад да бурнага далейшага росту колектывізацыі ў нашай рэспубліцы.

Перад намі асабліва востра стаіць пытаньне барацьбы з правай небясьпекай, якая, як і раней, застаецца галоўнай небясьпекай на даным этапе. Правыя ў сучасны момант імкнуцца скарыстаць любы вучастак, любыя труднасьці ў нашай рабоце для падрыхтоўчай работы супроць партыі. Мы павінны, не закрываючы вачэй, сказаць аб вялікіх труднасьцях, якія мы маем і якія ў нас будуць сустракацца ў далейшым. Пытаньне рабочага забесьпячэньня ў сучасны момант зьяўляецца адным з вострых пытаньняў. Трэба проста сказаць, што справа з рабочым забесьпячэньнем знаходзіцца не на належнай вышыні, мы яшчэ рашучага пералому ў гэтых адносінах ня маем, хоць і шмат робім. Мы маем яшчэ сям-там „вздохи" па прышчэпаўшчыне. Праявам прышчэпаўшчыны трэба і надалей даваць рашучы адпор, бо прышчэпаўшчына ва ўмовах БССР зьяўляецца аднэй з праяў правай небясьпекі.

Мы павінны ўзяць рашучы курс на выхаваньне нашых маладых партыйных кадраў. За апошні час мы маем надзвычайны ўздым актыўнасьці працоўных, які асабліва адчуваецца ў выкананьні промфінпляну. Праўда, на асобных вучастках ёсьць яшчэ прарывы, на зьнішчэньне якіх трэба зварачаць яшчэ больш пільную ўвагу.

Мы маем надзвычайны прыцёк у нашу партыю рабочых з вялікім вытворчым стажам, але ў пытаньні нашай партыйнай вучобы мы не даволі робім. Я ня ведаю, як гэта справа ў іншых акругах, але мне здаецца, што мы асабліва ня маем тэй значнай работы, якая павінна быць праароблена ў даным напрамку асабліва ў вёсцы. Трэба сказаць, што сёлета вучобу сярод партыйцаў мы правалілі. Што азначаюць нашы дробненькія ў гэтым напрамку посьпехі? Гэта нічога не азначае ў параўнаньні з тымі складанейшымі задачамі, якія партыя зараз заклікана вырашаць. Перад намі стаяць вялікія задачы ў гэтай галіне. Партыя і наш зьезд ня могуць прайсьці міма гэтых пытаньняў. Мы павінны паставіць гэта пытаньне з усёй вострасьцю, мы павінны дабіцца пералому.

У галіне работы з беднатой у нас ёсьць цэлы рад недахопаў. З беднатой не займаюцца, мотывуючы гэта тым, што, бачыце, беднота ад нас нікуды не ўцячэ. Такія разважаньні дапамагаюць і садзейнічаюць кулацкім элемэнтам пашыраць свой уплыў. У рабоце сярод бедноты і батрацтва мы павінны зрабіць рашучы пералом.

Трэба сказаць, што на пытаньні самакрытыкі таксама не зварачалася даволі ўвагі. Нашы організацыі невыстарчальна разгарнулі самакрытыку. Самакрытыка нам патрэбна асабліва ў гэты пэрыяд, калі мы дапусьцілі рад памылак, недахопаў. Для таго, каб гэтыя памылкі хутчэй ліквідаваць і перабудавацца для далейшай работы, неабходна пашырыць самакрытыку. Прэса ў БССР у гэтым напрамку зрабіла рад грубейшых памылак, слаба і нездавальняюча разгортваючы самакрытыку. Некаторыя таварышы кажуць, што самакрытыка гэта рэч добрая, але крытыкуючы трэба праяўляць асьцярожнасьць, каб „не перакрытыкавацца". Гэта зусім няправільная ўстаноўка. У пытаньнях самакрытыкі ў нас часта няма тэй бальшавіцкай вострасьці, якая павінна быць.

Мы павінны яшчэ больш узмацняць нашу работу як на палітычным, так і гаспадарчым і на культурным франтох. У нас павінна быць праведзена вялікая работа ў галіне ўзмацненьня абароназдольнасьці савецкай краіны.

На XIII зьезьдзе ўсе гэтыя пытаньні павінны быць пастаўлены з надзвычайнай глыбінёй і рэзкасьцю. Увесь наш зьезд павінен праходзіць пад знакам бязьлітаснай бальшавіцкай самакрытыкі і выпраўленьня недахопаў (воплескі).

Прамова тав. Скробута

Правільнасьць генэральнай лініі партыі, правільнасьць кіраўніцтва яе ЦК пацьвярджаецца тымі вялізарнымі дасягненьнямі ва ўсіх галінах соцыялістычнага будаўніцтва ва ўзмацненьні абароназдольнасьці нашага краю, якія мы зараз маем. Пад кіраўніцтвам ЦК партыя нашчэнт разьбіла контр-рэволюцыйныя выступленьні трацкістых, дала рашучы адпор правым ухілістым і „левым" загібшчыкам.

Пастанова ЦК па пытаньні політыка-моральнага стану Рабоча-Сялянскай Чырвонай арміі выбіла глебу ў носьбітаў галмачоўскіх настрояў і партыя рашуча пакончыла з гэтым.

Наша партыйная організацыя ў арміі пад кіраўніцтвам ЦК і ПУР'у правяла вялікую работу па падрыхтаваньні комуністых для адзінаначальнікаў. Партыйная організацыя мае вялікія посьпехі ў справе дапамогі ў гэтай рабоце. Партыйныя конфэрэнцыі як у вайсковых часьцях, так і ў грамадзянскіх організацыях, якія нядаўна адбыліся, паказваюць, што партыя ў цэлым, пад кіраўніцтвам ЦК, дабілася нябачанага да гэтага часу давер'я працоўных мас, павысіла да нябачаных памераў свой аўтарытэт у кіраўніцтве масамі, як на прадпрыемствах, так і ў Рабоча-Сялянскай Чырвонай арміі.

На базе росту нашага краю расьце і ўмацоўваецца баяздольнасьць РСЧА, не морскага і паветранага флёту. Роўналежна адбываецца тэхнічнае аснашчэньне нашай арміі. Таму ад нас вымагаецца як мага хутчэйшае асваеньне і найбольш мэтазгоднае скарыстаньне гэтай тэхнікі. У Чырвоным Паветраным Флёце ў гэтых адносінах праведзена ўжо вялікая работа.

У выніку адзінства і напружанай работы начскладу, работы партыйных



Тав. Манюк—рабочы гомельскага заводу імя Ланцуцкага, дэлегат зьезду

і комсамольскіх організацый мы маем вялікае павышэньне тэмпаў і якасьці баявой падрыхтоўкі, якія не адстаюць ад тэмпаў соцыялістычнага будаўніцтва. Мы зараз маем такога байца паветранага флёту, які гатоў у любую хвіліну памерці за комунізм. Гэта ёсьць вялікае дасягненьне нашай партыі, ЦК і ПУР'у. Але бяз уважлівага адбору кіраўніцтва, абучэньня і выхаваньня мы-б ня мелі такіх вялікіх посьпехаў у выхаваньні байца паветранага флёту.

Мы маем такі начсклад, які ў любую хвіліну гатоў аддаць сваё жыцьцё ў барацьбе за камунізм і нам трэба берагчы яго сілы і працаздольнасьць.

Прамова тав. Гнілякевіча

У галіне колектывізацыі набыты надзвычай вялікія посьпехі. На сёньня мы маем каля 12-13 проц. колектывізаванай плошчы сельскіх гаспадарак. Гэта дасягненьне трэба замацаваць.

За апошні пэрыяд мы маем вялікія посьпехі ў справе паляпшэньня становішча працоўных, паляпшэньня становішча рабочае клясы ва ўсім Савецкім Саюзе. Калі мы параўнаем становішча рабочае клясы Савецкага Саюзу і становішча рабочае клясы капіталістычных дзяржаў, дык убачым надзвычай вялікую розьніцу. За апошні год у Амэрыцы наглядаецца вялікі рост беспрацоўя: калі ў 1928 годзе лік беспрацоўных дасягаў 4 мільёнаў, дык у пачатку гэтага году 5-6 міл. беспрацоўных. Беспрацоўе ў Нямеччыне таксама значна вырасла. Гэта сьведчыць аб тым, што ў буйнейшых капіталістычных краёх беспрацоўе з кожным годам расьце.

У Савецкім Саюзе, наадварот, беспрацоўе зьмяншаецца: спачатку толькі аднаго гэтага году лік беспрацоўных мы зьменшылі на 40 проц., а ў нас, у Беларусі, мы маем яшчэ большае зьніжэньне. У нас, у БССР, яно дасягае 47 проц. зьніжэньня. Гэта гаворыць аб тым, што у нас умовы рабочае клясы з кожным годам паляпшаюцца. У наступным годзе мы будзем мець яшчэ больш значнае скарачэньне беспрацоўных. Ужо ў гэтым годзе мы адчуваем па некаторых групах рабочых, асабліва кваліфікаваных, вялікі недахоп. Мы адчуваем недахоп рабочых для будаўніцтва.

Усё гэта пацьвярджае правільнасьць лініі партыі і яе бальшавіцкага ЦК. Гэта гаворыць аб тым, што лінія партыі цалкам і поўнасьцю адпавядае інтарэсам рабочае клясы і працоўных мас Саюзу.

На вёсцы ў нас расьце сацыялістычны сэктар і гэтым самым ставіць перад намі задачы аб перабудове работы савецкіх, партыйных і профэсыянальных організацый на вёсцы. На гэта трэба зьвярнуць асаблівую ўвагу ў нашай далейшай рабоце.



Катун. 9 год на вытворчасьці (завод „Дрэвапрацоўвачнік", Менск). Комсамолец, ударнік, прыняты гэтымі днямі ў партыю.

Прамова тав. Хайтовіча

Тыя дасягненьні, якія мы маем, пяцігодка, за выкананьне якой мы ўзяліся, ня ў пяць, а ў чатыры гады, яскрава падцьвярждаюць правільнасьць лініі нашай партыі. У рэканструкцыі сельскай гаспадаркі мы маем перавышэньне тых наметак, якія прадугледжвала пяцігодка.

Правыя опортуністыя сваімі „тэорыямі" імкнуцца цягнуць партыю назад, прапануюць паслабіць тэмпы індустрыялізацыі краіны і рэконструкцыі сельскай гаспадаркі. Таму зусім правільнай зьяўляецца лінія партыі ў тым, што галоўны агонь барацьбы павінен быць накіраваны супроць правай небясьпекі, адначасова вядучы барацьбу з „левымі" загібамі. Асколкі трацкізму, якія разьбіты, — яшчэ сям-там прабуюць падняць сваю галаву, вядучы розныя паклёпы на партыю. Таму і на гэтым вучастку барацьбы за генэральную лінію партыі трэба завастрыць увагу партыйных організацый.

У нас ёсьць рад недахопаў, у якіх вінаваты мясцовыя організацыі, у якіх вінаваты мы самі, а не партыйнае кіраўніцтва. Вось узяць бы хоць пытаньне аб колектывізацыі. Мясцовыя організацыі ў гэтай справе зрабілі рад памылак між тым як ЦК Партыі ў справе колектывізацыі даў зусім выразныя дырэктывы, вызначыў зусім правільную ленінскую лінію.

У справе рабочага забясьпечаньня, па віне мясцовых організацый мы маем рад недахопаў і ляпсусаў. Мы падчас ня ўмеем выкарыстоўваць усіх тых мажлівасьцяй якімі распалагаем.

ЦК Партыі даў зусім выразную дырэктыву ў пытаньні падрыхтоўкі кадраў. А на месцах у гэтых адносінах мы маем рад недахопаў. У нас вылучаюць часамі на работу ў апарат рабочага і не клапоцяцца аб яго падрыхтоўцы і таму бывае так, што праз некатары час ён вымушан вярнуцца на сваю ранейшую работу. У пытаньні падрыхтоўкі кадраў трэба ўнесьці больш плянавасьці, вакол гэтага пытаньня трэба сканцэнтраваць больш увагі партыйных організацый.

РАПАРТУЕМ XIII ЗЬЕЗДУ КП(б)Б

Рабочыя, колгасьнікі, беднякі і серадн́які абяцаюць, што пад ленінскім кіраўніцтвам комуністычнай партыі аддадуць усю сваю энэргію і энтузіязм на ажыцьцяўленьне яе генэральных задач

Каманды ўсебеларуск га зьвёзднага вэлёпрабегу перадалі ад прадпрыемстваў і колгаса зьезду рапарты і прывітаньні

Плян вясновага севу перавыканалі

Заслухаўшы кароткую інформацыю аб вэлепрабегу каманды Магілеў—Менск, агульны сход колгасу „Комунар" даручае групе вэлёсыпэдыстых перадаць гарачае прывітаньне XIII-му ўсебеларускаму зьезду КП(б)Б і пажаданьне ў пладатворнай рабоце.

Сход перадае зьезду, што пастаўленае заданьне выкананьня плянаў пасеўкампаніі на 100 проц. намі выканана на 102 проц. і на 15 днён раней тэрміну

Мы запэўніваем XIII зьезд, што колгас „Комунар" і ў далейшым будзе энэргічна ажыцьцяўляць задачы партыі па колектывізацыі сельскай гаспадаркі і на аснове суцэльнай колектывізацыі, ліквідацыю кулацтва, як клясы.

У выпадку нападу зарубежных ворагаў, мы ў любы момант, па закліку партыі і савецкай улады, заменім плугі на стрэльбы, станем на абарону Савецкага Саюзу і дамо належны адпор нашым ворагам


Падарунак XIII-му зьезду КП(б)Б

1-га чэрвеня раніцай колгасьнікі Самахвалавіцкага раёну, у знак падарунку XIII-му зьезду нашай партыі, здалі 1000 цэнтнэраў хлеба.

Чырвоны абоз застанавіўся каля памяшканьня дзе засядаў XIII-ты зьезд КП(б)Б—зьезд выпрабаваных барацьбітоў за соцыялізм Ад імя колгасьнікаў Самахвалаўшчыны зьезд вітаў селянін-бядняк, зараз колгасьнік Ганул Павал. Ён запэўніў бальшавікоў Беларусі, што бядняцка-серадняцкія масы вёскі, пад кіраўніцтвам непахіснай комуністычнай партыі, пойдуць да далейшых перамог у галіне соцыялістычнага будаўніцтва.

— Няхай жыве комуністычная партыя і савецкая ўлада!—закончыў Ганул сваё прывітаньне

Па даручэньню зьезду колгасьнікаў віталі т. т. Чарвякоў, Сянькевіч і інш.



На здымку: дэлегатаў колгасьнікаў вітае ад імя зьезду КП(б)Б тав. Сянькевіч.

Ліквідуем прарывы, перавыканаем прамфінплян

Сход рабочых і работнікаў заводу „Домбаль" (г. Барысаў), заслухаўшы прывітаньне рабочых вэлёсыпэдыстых Віцебшчыны— удзельнікаў Усебеларускага вэлёпрабегу, прысьвечанага XIII зьезду КП(б)Б, перадае пролетарскае гарачае прывітаньне XIII-му зьезду КП(б)Б—кіраўніку і правадніку ідэй Ленінізму ў нашай практычнай рабоце і будаўніцтве соцыялізму.

Сход запэўнівае XIII-ты зьезд, што прарывы ў прамфінпляне будуць выпраўлены і плян перавыкананы на падставе яшчэ больш шырокага разгортваньня соцспаборніцтва і выкананьня рашэньняў зьезду, якія мы будзем праводзіць цьвёрда і няўхільна ў жыцьцё. узмацняючы магутнасьць нашай краіны.

Разам з гэтым яшчэ больш цесна згуртуемся навакол партыі і на ўсе выпадкі міжнароднай буржуазіі адкажам цьвёрдым і рашучым ударам.

Па даручэньню сходу З. К.

Пад кіраўніцтвам партыі і надалей будзем праводзіць усе яе мерапрыемствы

Колгас „Комунар" Бярэзінскага раёну, организаваўся ў мінулым годзе з 6-ці гаспадарак, на зямлі запаснага фонду Ён меў толькі 5 коняй, налічваў 23 едакі, з агульнаю плошчаю зямлі 200 г

Дзякуючы правільнай політыцы партыі і праведзенай культурна-масавай працы сярод насельніцтва, колгас вырас і зараз яднае 66 сямей у 242 чалавекі

Зараз у колгасе маецца 59 кароў, сьвіней 39, авец 29 шт.

Тэрыторыя колгасу займае зараз 600 г., з якой засеяна яравымі культурамі 290 г., канюшынаю—80 га і лубінам—40 га. Пад засеў завапнавана—8 г. і ўгноена мінэральнымі ўгнаеньнямі 40 г. Плян севу яравога выканан на 102 проц. і на 15 дзён раней тэрміну. Колгас так ама засеяў і яравы клін 2-х раскулачаных гаспадарак.

Мы, колгасьнікі „Комунару", запэўніваем XIII-ы Зьезд партыі, што і ў далейшым пад кіраўніцтвам партыі будзем таксама праводзіць усе мерапрыемствы па колгаснаму будаўніцтву і па ліквідацыі кулацтва, як клясы.

Горачае прывітаньне зьезду

Агульны сход рабочых саўгасу „Аліпаль" і колгасьнікаў „Новы Быт" і „Першага Мая", заслухаўшы даклад т. Саковіча а задачах рабочых і колгасьнікаў у выкананьні прамфінпляну і колектывізацыі сельскай гаспадаркі, выступленьне прадстаўнікоў (удзельнікаў вэлёкаманды) ад заводу „Комунар" і ф-кі „Акцябр" і кіраўніка саўгасу „Аліпаль" адзначае, што політыка партыі, накіраваная на будаўніцтва буйных фабрык і заводаў, на правядзеньне колектывізацыі і ліквідацыі, кулацтва, як клясы, на падставе суцэльнай колектывізацыі, зьяўляецца вернай Ленінскай політыкай. Сход адзначае, што БССР пад кіраўніцтвам КП(б)Б мае значныя посьпехі ў соцыялістычным будаўніцтве.

Сход горача вітае XIII-ты зьезд КП(б)Б і завярае, што ўсе цяжкасьці, якія сустракаюцца ў нашым будаўніцтве, будуць пераможаны і пад кіраўніцтвам КП(б)Б працоўныя масы Беларусі дасягнуць значных посьпехаў у гэтым гаспадарчым годзе, і напружанай працай выканаюць пяцігоду прамысловасьці і с-гаспадаркі ў чатыры гады.

Удзел віцебскіх фізкультурнікаў у гаспадарчым будаўніцтве

Папярэднія вынікі праверкі ўдзелу фізкультурнікаў у выкананьні прамфінпляну паказваюць, што з 808 фізкультурнікаў профсаюзаў гораду, якія непасрэдна працуюць на прадпрыемствах і ўстановах гораду, аказалася:

Ударнікаў—428 чалавек. Прэміяваных ударнікаў—23. Ахоплена вытворчымі нарадамі—324 чал (весткі ня поўныя). Увесена прапаноў па рацыяналізацыі вытворчасьці—12. Сабрана грошай на трактар „Фізкультурнік Беларусі"—370 рублёў. Камандыравана ад гурткоў фізкультуры ў вёску, у дапамогу пасеўкампаніі, колектывізацыі і г. д.—37 фізкультурнікаў, з тэрмінам на два тыдні, якія організавалі шэраг гурткоў ФК, чырвоных куткоў, перадалі спорт-інвэнтар, бібліотэкі, рамантавалі сельска-гаспадарчыя машыны і г. д. Фізкультурнікамі ачышчана па акрузе 16000 пудоў насеньня.

Дапамагалі партыі і будзем дапамагаць у барацьбе з скажэньнямі яе генэральнай лініі

Заслухаўшы даклад прадстаўніка Усебеларускага зьвёзднага вэлёпрабегу тав. Фрыдмана аб праходзячым партыйным зьезьдзе Беларусі, агульны сход в. Лісуноў Тулініцкага с.-с., Кохаnаўскага раёну перадае сваё прывітаньне вышэйшаму кіраўніку КП(б)Б XIII зьезду і запэўнівае, што ўскладзеныя на нас партыяй задачы выконваем і будзем выконваць. Пашырым плошчу пасеву на 12 проц. Вясеньні сеў закончылі на 90 проц. і к 30-У выканаем на ўсе 100 проц.

Менская абутковая фабрыка рапартуе:

Партколектыў Менскай абутковай фабрыкі нядаўна прыняў рашэньне аб давядзеньні прамфінпляну да кожнага цэху і рабочага паасобку. Зараз выконваецца гэта пастанова. Фабрыка ставіць мэтай дабіцца да XIII зьезду КП(б)Б і XVI зьезду УсеКП(б) карэннага пералому ў сваёй працы. Гэта будзе лепшым падарункам да чарговых партыйных зьездаў.

Да гэтага часу абутковая фабрыка яшчэ знаходзіцца кандыдатам на чорную дошку, але яна організоўвае ўсе сродкі, каб к часу зьезду ліквідаваць свае прарывы і заваяваць сабе месца на чырвонай дошцы.

Дзякуючы буйным тэмпам працы ф-ка ідзе шпаркім крокам да ліквідацыі прарываў. Цэлы шэраг лічб сьведчыць аб гэтым. Якасьць продукцыі таксама палепшылася. У першых лічбах мая мы мелі 20 пар браку ў дзень,—за апошнія дні мы маем усяго 2-3 пары.

Да УШ конфэрэнцыі Менскай партыйнай організацыі ф-ка паднесла падарунак—18 лепшых ударнікаў перадала ў шэрагі партыі, сярод іх ёсьць рабочыя з 30-гадовым вытворчым стажам.

Пасьпяховая ліквідацыя прарываў і барацьба за пяцігодку будзе лепшым падарункам да нашых чарговых партыйных зьездаў ад рабочых Менскай абутковай фабрыкі

Леў.

Вынікі зьвёзднага вэлё-прабегу

1-га чэрвеня закончыўся другі ўсебеларускі зьвёздны вэлё-прабег. Зараз ёсьць поўная магчымасьць падвесьці асноўныя вынікі гэтага, маючага вялікае політычнае значэньне, мерапрыемства. Побач з тым станоўчым, што даў прабег, трэба адзначыць і яго адмоўныя бакі і політычныя ляпсусы.

Усебеларускі зьвёздны вэлё-прабег у параўнаньні з першым зьвёздным вэлё-прабегам, які праводзіўся ў мінулым годзе, больш насычан політычнай мэтаімкнёнасьцю—і ў гэтым першае і асноўнае дасягненьне вэлё-прабегу гэтага году. Прабег быў прысьвечаны 13-му зьезду КП(б)Б і з гэтага выцякалі задачы і практычная работа прабегу. Растлумачыць колгасьнікам, бядняцкім масам вёскі аб вузлавых задачах партыі на сучасным этапе соцыялістычнага будаўніцтва, расказаць працоўным вёскі, як рабочыя фабрык заводаў выконваюць прамфінплян, як комуністычным мэтадам працы, ударніцтвам і соцспаборніцтвам пролетарыі гораду зьніжаюць сабекошт, узьнімаюць якасьць продукцыі і на гэтай падставе, замацоўваюць вытворчую змычку гораду і вёскі, растлумачыць аб перагібах у колектывізацыі і аб тым, што перагібы зьяўляюцца скажэньнем гэтай політыкі партыі асобнымі горакалектывізатарамі, партыйцамі і асобнымі партыйнымі організацыямі, што ўся партыя пад кіраўніцтвам ленінскага ЦК рашуча змагаецца з перагібамі —у такім разрэзе павінна была будавацца практычная работа ўдзельнікаў усебеларускага зьвёзднага вэлё-прабегу.

Побач з гэтым перад прабегам ставіліся задачы конкрэтным паказам продэмонстраваць перад масамі фізкультурнікаў Беларусі і ўсёй савецкай грамадзкасьцю, як не на словах, а на справе патрэбна перабудоўваць зьмест і мэтады фізкультурнай работы, падначаліўшы іх задачам соцыялістычнага будаўніцтва.

Вынікі прабегу, якія былі падведзены на нарадзе ўсіх удзельнікаў прабегу, рапарты, якія сёньня зьмяшчаюцца ў газэце, гавораць аб тым, што ўдзельнікі вэлё-прабегу з пастаўленымі задачамі ў асноўным справіліся. Усімі камандамі ў часе прабегу праведзены дзесяткі сходаў, колгасьнікаў, сялян, рабочых закінутых у глушы прадпрыемстваў і местачковай беднаты. Гэтыя сходы па прыкладу Менскай каманды, фактычна пераўтвараліся ў сходы вытворчай змычкі рабочых вэлёсыпэдыстых з працоўным сялянствам. Рабочыя ад варштату рабілі справаздачу аб сваёй рабоце, сваіх дасягненьнях, а колгасьнікі і бядняцка-серадняцкія масы, якія ўдзельнічалі ў гэтых сходах, рапартавалі аб выкананьні плянаў вясновай сяўбы, пашырэньні пасеўнай плошчы, узьняцьці ўраджайнасьці. Удзельнікі каманды прывезьлі 13-му зьезду КП(б)Б ад тысяч сялян шчырае прывітаньне.

Прайшоўшы ў выключна цяжкіх умовах (дрэнныя дарогі і надвор'е) зьвёздны вэлё-прабег даказаў вялікую вынослівасьць вэлёсыпэдыстых. Даў значную трэніроўку, навыкі, орыентыроўкі і яшчэ раз падкрэсьліў месца і ролю самакатчыкаў, як сродак сувязі на выпадак вайны.

З 60 вэлёсыпэдыстых, удзельнічаўшых ва ўсебеларускім зьвёздным прабезе, 51 чалавек рабочых і 42 партыйцаў і комсамольцаў. Наогул соцыяльны і партыйна-комсамольскі склад удзельнікаў прабегу здавальняючы і гэтым у значнай ступені тлумачыцца пасьпяховасьць выкананьня задач прабегу.

Прабег не абышоўся і без недахопаў і прытым даволі значных. Некаторыя акруговыя саветы фізкультуры (Магілеўскі, Полацкі і часткова Менскі) прынялі зусім слабы ўдзел у падрыхтоўцы каманд для прабегу. У выніку каманды гэтых акруг не прапрацавалі, а гэта значыць і ня досыць поўна ўцямілі політычныя задачы прабегу. Так, напрыклад, Магілеўская каманда (па словах капітана каманды) ставіла сваёй асноўнай мэтай пропаганду 100% колектывізацыі акругі, зусім не зьвярнуўшы ўвагі на растлумачэньне сутнасьці перагібаў—скажэньняў генэральнай лініі партыі, якія ў акрузе былі больш масава распаўсюджаны, аб гэтым у першую чаргу трэба было гаварыць Магілеўцам, растлумачваючы сутнасьць гэтых перагібаў і політыку партыі ў галіне колектывізацыі вёскі.

У выніку галавацяпства Полацкага акрсавету фізкультуры каманда прабегу Полацку была складзена на 60% з служачых і толькі на 40% з рабочых.

Таму зусім правільна тое, што нарада удзельнікаў прабегу вынесла пастанову аб разглядзе гэтага пытаньня на ВСФК і прыцягненьня полацкіх кіраўнікоў фізкультуры да суровай адказнасьці.

На фінішы Аршанская каманда патрабавала, каб у дэмонстрацыі ёй прадставілі месца за Менскай камандай, пагражаючы, што ў працiўным выпадку яна пакіне фініш. Матывіроўка гэтага агіднага факту была яшчэ больш агіднай — прасякнутай духам рэкордсмэнства і дзяляцтва. Бачыце, аршанцы прыбылі на фініш усьлед за Менскай камандай, таму па думцы аршанскіх дзяляг ім патрэбна было другое месца і ў калёнах дэмонстрантаў вэлёсыпэдыстых. І гэта ў той час, калі асноўны прынцып прабегу быў не рэкордсмэнства, а політычная работа ў дарозе. З гэтага пункту гледжаньня і Магілеўская каманда ўпарола ляпсус. Магілеўцы пад'ехалі да Менску на суткі раней замест таго, каб гэты час скарыстаць на політычную работу на вёсцы, акалачваліся па ваколіцах Менску. Усім гэтым элемэнтам рэкордсмэнства і вузкалобага дзяляцтва нарада дала рашучы адпор.

Другі ўсебеларускі зьвёздны вэлёпрабег ня глядзячы на гэтыя недахопы паказаў, што фізкультура Савецкай Беларусі практычна пераходзіць на рэйкі ажыцьцяўленьня асноўнага лёзунгу—„фізкультуру на службу соцыялістычнаму будаўніцтву".

П. Саковіч.

АБ ПРАЦЫ ПАДЛЕТКАЎ І ДЗЯЦЕЙ У КОЛГАСАХ

(Артыкул загадчыка вясковага сэктару ЦК УсеЛКСМ т. Панцюхова)

Рост колектывізацыі сельскай гаспадаркі ўтварае неабходныя прадпасылкі для перабудовы працы падлеткаў у сельскай гаспадарцы на социялістычных пачатках. Мы ўжо зараз павінны практычна заняцца вырашэньнем гэтай важнейшай задачы, імкнучыся максымальна абмежаваць гаспадарча-вытворчую працу дзяцей у сельскай гаспадарцы, а ў самым бліжэйшым будучым зусім выжыць і забараніць яе ўжываньне ў тым выглядзе, у якім яна ўжываецца зараз.

Аднак пры вырашэньні гэтага пытаньня неабходна праявіць вялікую асьцярожнасьць, ні ў якім выпадку ня імкнуцца вырашыць яе „адзіным махам". Вопыт, набыты комсамолам у прамысловасьці па социялістычнай організацыі працы моладзі, мы, бязумоўна, павінны скарыстаць і скарыстаем. Але мы не павінны мэханічна, па шаблёну, пераносіць у колгасы тыя формы і мэтады організацыі працы і аплаты падлеткаў, якія маюцца ў прамысловасьці.

Пры вырашэньні пытаньня організацыі і аплаты працы падлеткаў у колгасах патрэбна ўлічваць у першую галаву тое, у якім становішчы ў даны пэрыод знаходзяцца колгасы. Патрэбна ўлічыць і экономічную моц на данай стадыі колгаснага будаўніцтва. Шэраг мясцовых організацый і асобных таварышоў пры распрацоўцы гэтага пытаньня дапускаюць памылкі іменна ў тым, што не даўлічваюць гэтага моманту, ня ўлічваюць ні экономічнай моцы колгасу, ні ступені мэханізацыі і г. д.

Як мы павінны падысьці да працы падлеткаў і дзяцей у колгасах? Нам патрэбна ўлічваць усе ўмовы і асаблівасьці колгаснага руху на данай стадыі яго разьвіцьця, зрабіць першыя ОРЫЕНТОВАЧНЫЯ НАТАТКІ, вызначыць асноўныя прынцыпы социялістычнай організацыі працы падлеткаў і дзяцей у колгасах з тым, каб у далейшым, па меры росту экономічнай магутнасьці колгасаў і нашага вопыту ў гэтым пытаньні, сыстэматычна ўдасканальваць нашы патрабаваньні і нашу програму.

Саюз павінен зараз вызначыць свае адносіны да пытаньня працяжнасьці рабочага дня, прынцыпам аплаты працы і г. д. Паўтараем, што пры вырашэньні гэтых пытаньняў патрэбна ўлічваць асаблівасьці сельскай гаспадаркі, адрозьненьне сельскай гаспадаркі ад прамысловасьці.

Так, выходзячы з асаблівасьці сельскай гаспадаркі (праца на паветры, адсутнасьць у большасьці колгасаў мэханізацыі і г. д.) упаўне мэтазгодна і правільна будзе ўстанавіць у сельскай гаспадарцы ў адрозьненьні ад прамысловасьці прыкладна такія ўзростныя нормы, як для хлапцоў, так і для дзяўчат:

а) Дзіцячы ўзрост лічыць да 12 год.

б) Падлеткавы ўзрост з 12 да 16 з падзелам на групы ад 12 да 14 год і ад 14 да 16 год.

Неабходна катэгарычна выступіць супроць допуску да гаспадарча-вытворчай працы ў колгасах дзяцей да 12-гадовага ўзросту. ПРАЦА ДЗЯЦЕЙ ПАВІННА НАСІЦЬ ВЫКЛЮЧНА ВУЧЭБНА-ВЫТВОРЧЫ ХАРАКТАР—ГЭТА ЗНАЧЫЦЬ ПАВІННА БЫЦЬ ПАДНАЧАЛЕНА ЗАДАЧАМ ПОЛІТЭХНІЧНАГА ВЫХАВАНЬНЯ. ТАМУ КОМСАМОЛЬСКІЯ ОРГАНІЗАЦЫІ ПАВІННЫ ОРГАНІЗАВАЦЬ УДЗЕЛ ДЗЯЦЕЙ У ВЫТВОРЧЫХ ПРОЦЭСАХ КОЛГАСАЎ ВЫКЛЮЧНА ПРАЗ ПІОНЭРОРГАНІЗАЦЫЮ СУМЕСНА СА ШКОЛАЙ. ПРЫ ГЭТЫМ УЖО Ў НАСТУПНУЮ ПАЛАСУ СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧЫХ РАБОТ І АЖ ДА ВОСЕНІ ТРЭБА ДАБІЦЦА МАКСЫМАЛЬНАГА АБМЕЖАВАНЬНЯ ЎЖЫВАНЬНЯ ПРАЦЫ ДЗЯЦЕЙ І ЯЕ У АБАГУЛЕНЫХ ЧАСТКАХ ГАСПАДАРКІ КОЛГАСЬНІКАЎ.

Якім-жа павінен быць працоўны дзень падлетка? Неабходна ўстанавіць такую працягласьць яго, каб давала-б колгасу магчыма большы вытворчы эфэкт і ў той-жа час не адбівалася-б на нормальным разьвіцьці падлеткаў. Выходзячы з гэтага, фактычны працоўны дзень падлеткаў, узросту ад 12 да 14 год, павінен складацца не больш як з 6 гадзін, а пры ўзросьце ад 14 да 16 год—ня больш 8 гадзін у дзень. Акрамя гэтага, павінен быць абавязкова ўстаноўлен пэрыод дня, калі магчыма ўжываць працу падлеткаў тэй альбо іншай узростнай групы (раніцай, вечарам і г. д.) і на якіх работах. У пэрыод максымальнага разгортваньня сельска-гаспадарчых работ прыдзецца дапускаць павялічэньне працоўнага дня падлеткаў ад 14 да 16 год, але, па-першае, ня больш, як на 2 гадзіны, а, па-другое, выключаючы дзяўчат гэтага ўзросту.

Зразумела, у пэрыод бягучых сельска-гаспадарчых работ, указаны працоўны дзень падлеткаў будзе запоўнены фізычнай працай, але ў далейшым пры ахопе падлеткаў вучнёўствам у працоўны дзень падлеткаў павінен уваходзіць і час іх тэорэтычнай вучобы (у школах і г. д.).

У шэрагу колгасаў мы маем падсобныя прадпрыемствы прамысловага тыпу (кузьні, рамонтныя майстэрні, базы і г. д.). Тут, бязумоўна узростная норма і працоўны дзень падлеткаў павінен быць такім жа, што і ў прамысловасьці, з некаторымі невялікімі зьменамі.

Шмат каго зараз хвалюе пытаньне аб аплаце працы падлеткаў. У аснову павінен быць тут паложан прынцып—„за аднолькавую працу —аднолькавая плата".

Зусім недарэчны і шкодны прапановы аб увядзеньні вучнёўскай сеткі для падлеткаў. Тыя, хто прапануюць гэта, па-першае, зрываюць прынцып—„за роўную працу —роўная аплата", бо вучнёўская сэтка мяркуе паніжаную расцэнку працы падлетка, па-другое, відаць, ня маюць уяўленьня аб тым, што праца падлеткаў ў сельскай гаспадарцы цалкам вытворча і гаспадарча каштоўна. Акрамя таго, таварышы забываюць, што мы ў першую чаргу павінны зараз клапаціцца аб пераважнай большасьці падлеткаў-колгасьнікаў, якія не ахоплены ніякім навучаньнем. Прынцыпы і мэтады іх аплаты мы павінны зараз-жа ўстанавіць. Прапануючыя ўвядзеньне вучнёўскай сеткі ў колгасах і даплату за скарочаны рабочы дзень зусім выпушчаюць з віду розьніцу паміж прамысловасьцю і колектывізаванай сельскай гаспадаркай і пераацэньваюць гаспадарчыя магчымасьці апошняй.

Вельмі важна правільна паставіць разьлікі з падлеткамі і выдачу зарплаты. Ці трымаць асобную разьліковую кніжку на кожнага падлетка, ці пералічаць заработак апошняга на імя галавы сям'і. Ад правільнага вырашэньня гэтага пытаньня залежыць самастойнасьць падлетка, яго экономічная незалежнасьць ад сям'і і, нарэшце актыўнасьць і зацікаўленасьць яго ў гаспадарчым будааніцтве колгасу. Гэтае пытаньне шэраг організацый ставіць няправільна. Прапаноўваючы пералічаць заработак падлетка-колгасьніка на імя галавы сям'і, яны гэтым самым зьвязваюць па руках і нагах падлетка, ставяць яго цалкам у ранейшую залежнасьць ад галавы сям'і, пакідаючы гэтым самым тое становішча, якое панавала ў сям'і селяніна індывідуальніка. Гэтым самым значна паніжаецца ў грамадзкім політычным жыцьці колгасу роля падрастаючага колгаснага маладняка. Дзеля гэтага зараз-жа трэба дабівацца ўвядзеньня разьліковых кніжак на кожнага падлетка, які працуе ў колгасе. Гэта мерапрыемства трэба ажыцьцявіць ужо ў бягучым годзе, шырока растлумачваючы комсамольцам і масе колгасьнікаў буйнейшыя значэньні гэтага новаўвядзеньня.

Як ахоўваць працу і здароўе падлеткаў? Ці можам мы ў сучасны момант вызначыць у гэтым пытаньні хаця-б прынцыповую лінію саюзу? Зразумела, можам. Па-першае, трэба дабівацца таго, каб праца падлетка ад 12 да 16 год скарыстоўвалася на больш лёгкіх работах, па-другое—комсамольскія організацыі, сумесна з спэцыялістамі аграномамі і мэдычнымі работнікамі, з кіруючымі колгаснымі працаўнікамі і савецкімі органамі, павінны распрацаваць хаця-бы мінімальны орыентовачны сьпіс тых работ, на якія праца падлетка тэй ці іншай узроснай групы не павінна дапушчацца. Гэты сьпіс трэба ўвесьці ў сілу ўжо ў гэтым годзе з тым, каб у далейшым аформіць праводзімыя мерапрыемствы ў законадаўчым парадку.

Пытаньне аб працы падлеткаў і дзяцей у колгасах як для ўсяго саюзу, так і для ўсёй савецкай грамадзкасьці—пытаньне новае і складанае. Значэньне яго колёсальнае. Зараз мы павінны ўстанавіць асноўныя палажэньні, якія-б мінімальна забясьпечвалі організацыю працы падлеткаў у колгасах і дабіцца ажыцьцяўленьня гэтых палажэньняў. На аснове практычнага вопыту розных галін сельскай гаспадаркі з рознай ступеньню іх мэханізацыі, саюз зможа ў далейшым канкрэтызаваць свае прапановы, дэтальна распрацаваць іх дапасавальна да асобных галін сельскай гаспадаркі (паляводзтва, жывёлаводзтва і г. д.), максымальна ўлічваючы экономічную моц колгасаў. У залежнасьці ад экономічнай моцы колгасу будзе знаходзіцца цэлы шэраг асноўных прапаноў комсамолу па гэтым пытаньні, гэтага нельга ні на хвіліну забываць. Па меры ўмацаваньня вопыту, мы павінны ўдасканальваць сыстэму організацыі працы падлеткаў у колгасах, будуючы яе на сапраўдна социялістычных пачатках.

Правілы прыёму

у Магілеўскі дзяржаўны земляўпарадчы тэхнікум на 1930-31 нав. год.

1) У тэхнікум прымаюцца асобы ўзростам ад 14 да 25 год, скончыўшыя (незалежна ад году сканчэньня) поўны курс 9-цігадовай працоўнай школы II-й ступені, 2-х гадовых агульна-асьветных курсаў, 7-мі гадовых працоўных школ, школы для дарослых павышанага тыпу, школы сялянскай моладзі і профшколы на базе 4-х-годкі і пасьля 3-хгадовага вытворчага стажу і курсы па падрыхтоўцы ў тэхнікумы. Таварышы, скончыўшыя вышэйпамянёныя школы, прымаюцца бяз іспытаў.

Тэхнікум у гэтым годзе прымае 180 асоб: 90 асоб да 1-га кастрычніка і 90 асоб да 1-га сакавіка.

Прыём заяў пачынаецца з 10 ліпеня па 1-е жніўня г. г.

Заявы падаюцца на імя прыймовай камісіі пры тэхнікуме, да заявы далучаюцца наступныя дакуманты:

1) Дакуманты аб узросьце (мэтрыка);

2) Дакумант аб адносінах да вайсковай павіннасьці (для мужчын);

3) аб асьвеце;

4) 2 фотографічныя карткі;

5) Мэдычныя пасьведчаньні аб стане здароўя паступаючага;

6) дакумант, які сьведчыць аб матар'яльным і социяльным становішчы паступаючага, яго бацькі да і пасьля рэволюцыі;

7) Даведка, засьведчаная нізавой савецкай організацыяй аб тым, што паступаючы і яго бацькі не пазбаўлены выбарчых правоў.

8. Для сялян акладны ліст на 1929-30 г., а для саматужнікаў—патэнт;

9) Анкету, засьведчаную прафэсыянальнымі або савецкімі організацыямі;

10) паштовых марак для адказу на 25 кап.

УВАГА: Вытрымаўшы іспыты ў 1928—29—30 г. г. пры наступленьні ў тэхнікум вызваляюцца ад усялякіх іспытаў. Пры прыёме перавага будзе давацца асобам, якія маюць практычны стаж па адпаведнай спэцыяльнасьці і скончыўшыя прафшколы.

Тэрмін іспытаў і залічэньня ўстанаўляецца з 1-га па 10 жніўня г. г. —з 10-га па 15 жніўня. Аб выніках прыёму паведамляюцца ўсе асобы, якія падалі заявы аб прыёме ў тэхнікум.

Пачатак заняткаў 1-га кастрычніка г. г.

Заг. навуч. часткі Мацьвеенка.

Да ХУІ-га зьезду УсеКП(б)

ЭСТАФЭТА ПРАЦОЎНЫХ ДАСЯГНЕНЬНЯЎ

Комсамольскія ячэйкі фабрык, заводаў і колгасаў, рыхтуйце рапарты XVI зьезду УсеКП(б)Б

Усесаюзная „эстафэта працоўных дасягненьняў", організаваная Вышэйшым Саветам Фізкультуры СССР, аб правядзеньні якое мы сёньня друкуем, адозву „Комсамольскай Праўды", мае вялікае політычнае значэньне. Гэтая эстафэта павінна будзе перадаць ХУІ зьезду ЎсеКП(б)Б рапарты агляду вытворчых дасягненьняў, выкананьня прамфінпляну, разгортваньня соц. спаборніцтва, ударніцтва, выкананьня задач пасеўнай кампаніі і г. д. Эстафэта па шляху сьледваньня правядзе шэраг масавых мерапрыемстваў па растлумачэньню задач партыі і яе дырэктыў, па пытаньнях социялістычнага будаўніцтва.

Справіцца с гэтымі вялікімі задачамі эстафэта зможа пры ўмовах правядзеньня належнай падрыхтоўчай работы, організацыі навокал гэтага вэлёпрабегу грамадзкай думкі, з тым, каб дапамагчы ўдзельнікам эстафэты мобілізаваць масы рабочых, рабочай моладзі, колгасьнікаў, батракоў, беднякоў і серадлякоў на ажыцьцяўленьне задач партыі, на праверку сваіх гаспадарчых посьпехаў, на складаньне рапартоў ХУІ зьдзду УсеКП(б).

Згодна папярэдніх меркаваньняў Вышэйшага Савету Фізкультуры Беларусі, беларускія ўдзельнікі эстафэты павінны будуць праехаць наступны маршрут: Менск—Сьмілавічы, Сьмілавічы—Барысаў. Барысаў—Крупкі. Крупкі — Талочын. Талочын—Ворша. Ворша—Ляды і Ляды—Краснае. Пасьля беларускую каманду прыме каманда Заходняй вобласьці.

Комсамольскія організацыі, якія знаходзяцца на шляху сьледваньня эстафэты, павінны неадкладна прыступіць да шырокай масавай падрыхтоўчай работы. Гэта работа павінна заключацца ў мобілізацыі мас рабочых і моладзі па дапамогу партыйным і профсаюзным організацыям, выканаць задачы партыі ў галіне пасьпяховага выкананьня прамфінпляну, ліквідацыі прарываў, разгортваньня соц. спаборніцтва і ўдарніцтва, ажыцьцяўленьня пляну вясновага севу і г. д. З гэтай мэтай ячэйкі павінны правесьці шэрах масавых мерапрыемстваў і організаваць масы рабочых і моладзі на складаньне рапартоў, аб выкананьні прамфінплянаў і плянаў севу і перадачы гэтых рапартоў праз удзельнікау эстафэты ХУІ зьезду Усесаюзнай Комуністычнай Партыі.

Комсамольскія камітэты ў гэтай падрыхтоўчай рабоце павінны забясьпечыць належнае кіраўніцтва.

Усім партыйным і комсамольскім газэтам, усяму фабрычна-заводзкаму друку ў гарадох і прамысловых пунктах, якія ляжаць на маршрутах „эстафэты працоўных дасягненьняў"

Асобна комсамольскім газэтам: „Смена" (Ленінград), «Комсамолец" (Архангельск) «Большевитский Молодняк» (Смоленск) „Молодой Коммунар" (Тула), „Ленинец" (Іванава Вазьнясенск) „Молодой Коммунар" (Воронеж). „Ленинская Смена), (Ніжні-Ноўгарад), „На смену" (Сьвярдлоўск), „Резервы" (Сталінград), „Большевитская Смена» (Растоў-на-Доне), „Комсомолец Украины" (Харкаў) „Молодой Большевик" (Кіеў), „Молодой Рабочий" (Сталіна). „Чырвоная Зьмена" (Менск), „Молодой Ленинец" (Тыфліс).

Дарагія таварышы!

На фабрыках, заводах, руднікох ідзе зараз хваля агляду вытворчых дасягненьняў, падрыхтоўваюцца рапарты да ХУІ зьезду УсеКП(б) аб выкананьні прамфінпляну, давядзеньня яго да кожнага варштата, зьніжэньні сабекаштоўнасьці, правядзеньня барацьбы з стратамі на вытворчасьці і з прагуламі, разьвіцьці социялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва. Праз некалькі дзён з Ленінграда, Архангельску, Кастрамы, Сьвярдлоўску, Сталінграда, Тыфлісу, Севастопалю, Адэсы і Менску выходзіць організаваная УсеСФК вэлё-мото-аўтоэстафэта, якая панясе рапарты вытворчасьці ў Маскву XVI зьезду партыі. Патрэбна каб друк актыўна падтрымаў гэтую справу.

Неабходна шырока асьвятляць кампанію агляду, падрыхоўкі рапартоў, дабівацца правядзеньня рапартоў праз суровейшы кантроль рабочай грамадзкасьці. Неабходна дапамагчы посьпеху эстафэты, вылучэньню ўдзельнікаў. Шырока інформаваць насельніцтва аб маршрутах эстафэты, гадзінах і пунктах зьмены этапаў.

Посьпех агляду вытворчых дасьгненьняў, посьпех дастаўкі рапартоў на XVI зьезд УсеКП(б) у значнай ступені залежыць ад вашага ўдзелу ў гэтай справе.

РЭДАКЦЫЯ „КОМСОМОЛЬСКОЙ ПРАВДЫ"

ЛІСТ У РЭДАКЦЫЮ

У зьмешчаным у „Чырвонай Зьмене" ад 6-ІУ—30 г. за № 121 артыкуле «ЛКСМБ да XIII зьезду КП(б)Б" у чацьвертым разьдзеле ў 35 радку пры зусім правідловай думцы пяўдала сформулявана:

Пасьля слоў:—„Без сапраўднага выпраўленьня," трэба чытаць:—„Безагаворачнае выпраўленьне памылак і перагібаў у працы па колектывізацыі, растлумачваючы іх карэньні, шкоднасьць, выхоўваючы па гэтым масы комсамольцаў у духу генэральнай лініі партыі гэтым самым папярэджваць магчымасьць паўтарэньня гэтых памылак". І далей:— „Вясковыя ячэйкі" і г. д.

З ком. прывітаньнем: **М Палякоў.**

Паведамленьне

Ф. Р. К. ЛКСМБ паведамляе, што 8-га чэрвеня а 7 гадзіне ўвечары ў пам. Дому Працас веты адбудзецца нарада політбайцоў па пытаньню аб выніках політбою. Модус прадстаўніцтва—адзін ад 5-ці.

Адказны рэдактар
Рэдкалегія

Менск, друкарня БДВ імя тав. Сталіна

Галоўлітбел № 599